Б 9407

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца з 9-й да 3½ гадз. Рукапісы, якія ўмешчаны не будуць, назад ня вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. На 3 месяцы — 2 р. — к. На 6 месяцаў — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Замена адрасу: ішчагодняя — 20 к., месцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашыранай васьмі тэксту — р. 50 к. За радок пашыранай пасярэдзіне тэксту 1 р. — к. За радок пашыранай перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазваляюцца. Замы тарыфу бяруцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 15 кап. За кожны дадатковы — 15 к. Бесспрэчныя і чырвонаармейскія дакументы — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 2 (2190) Аўторак, 3-га студзеня 1928 г.

Прэзыдыум Бюджэтнай Камісіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту паведамляе, што 3-га СТУДЗЕНЯ А 6 ГАДЗ. УВЕЧАРЫ Ў ВЯЛІКАЙ ЗАЛІ ЦВК-СНК АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМУ БЮДЖЭТНАЕ КАМІСІІ ПА ПАРАДКАМ ДНЮ:

1) Дакладзіць даныя Народнага Камісарыяту аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР у 1926-27 бюдж. годзе. (Дакл. ад НКФ БССР.)

2) Дзяржаўны Бюджэт БССР на 1927-28 бюдж. год. (Дакл. ад СНК).

а) Дакład Падкамісіі падаходнай часьці дзяржаўнага бюджэту БССР на 1927-28 бюджэтны год.

(Дакл. Старш. П-Камісіі т. Платун)

б) Дакład Падкамісіі па расходнай часьці дзяржаўнага бюджэту БССР на 1927-28 бюдж. год.

(Дакл. Старш. П-камісіі т. Хацкевіч)

Свод мясцовых бюджэтаў на 1927-28 бюдж. год.

(Дакл. ад СНК і Старш. П-камісіі тав Калнін).

Прэзыдыум Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ У 1928 ГОДЗЕ.

Найвялікшыя задачы барацьбы за новы сацыялістычны лад наша краіна вырашае на аснове залучэньня ў барацьбу і будаўніцтва праз саветы самых шырокіх мас рабочых, работніц, сялян і сялянак.

Дзякуючы таму, што кожны рабочы і селянін сьвядома ішоў за саветы на барацьбу супроць свае буржуазіі і супроць усяго капіталістычнага сьвету, мы перамаглі, хоць тэхнічныя перавагі былі на баку буржуазіі.

Гэтакіх-ж сама агульнымі натугамі рабочых і сялян мы справіліся з надзвычайна цяжкаю спадчынаю вайны, развалюцыйнай барацьбы, голаду і інш., цьвёрда стаўшы на шлях аднаўленьня нашай гаспадаркі ўзвадваньня ўлады саветаў.

У гэты час краіна саветаў уступіла ў новую палосу шырокага плянавага сацыялістычнага будаўніцтва: індустрыялізацыя краіны, інакш—ператварэньне нашай краіны з земляробчай у прамыслова-земляробчую; пераабудаваньне сельскай гаспадаркі на аснове калектывізацыі працы, прыład вытворчасьці, збыту даставкі, каб аблегчыць працу сельскага гаспадара і падняць яго дабрабыт; шырокае культурнае будаўніцтва, — вось тыя новыя задачы, якія пастаўлены на вырашэньне XV-м Зьездам Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў).

Кожнаму павінна быць ясна, што гэтыя новыя задачы непасрэднага сацыялістычнага будаўніцтва мы зможам вырашыць зноў такі толькі пры ўмове пастаяннага, сьвядомага і актыўнага ўдзелу рабоча-сялянскіх мас у рабоце саветаў.

Вось чаму XV Зьезд Камуністычнай Партыі зазначыў на необходнасьць зьвярнуць асаблівую ўвагу на «працяг палітыкі ажыўленьня саветаў, як цэнтраў палітычнага выхаваньня мас працоўнага селянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту», як тых органаў, якія даюць пастаянную, шчыльную, неразрыўную, лёгка правяраемую і лёгка аднаўляемую сувязь з масамі, з большасьцю народу. Важнейшым момантам дзейнасьці саветаў зьяўляюцца перавыбары: у час перавыбараў увесь працоўны народ прямае непасрэдны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, што падводзіць нас к ажыцьцяўленьню непасрэднай, інакш — самай шырокай, поўнай і простай дэмакратыі, справаздачы аб працы саветаў у час перавыбараў падагульваюць дасягненьні пройдзенага і вызначаюць задачы далейшага; праз перавыбары мы маем магчымасьць праверыць суадносінасьць вылучаных у саветы рабочых і сялян, замацаваць лепшых у актыве, адкінуць негодных; нявартых урошце, перавыбары захоўваюць нашы саветы ад бюракратычнага зацьвярдзеньня і перараджэньня.

Выходзячы з гэтага вялікага значэньня перавыбараў, XV-ы зьезд УсеКП(б) даў наступныя асноўныя зазначэньні ў зьвязку з перавыбарчай кампаніяй 1928 г.:

Першае — «разгарнуць шырокую справаздачную кампанію аб працы саветаў», каб кожны рабочы і селянін ведаў як аб нашых дасягненьнях, так і недахопах. Каб справаздачная кампанія дала магчымасьць рабочым і сялянам прымаць непасрэдны ўдзел у працы саветаў праз ацэнку пройдзенага і заданьняў на будучыню;

Другое — „Залучыць у выбары максімум бядняцка-серадняцкіх пластоў". Тут нічога не гаворыцца пра рабочых, бо лічыцца само сабой зразумелым, што ўсе 100 проц. рабочых павінны, абавязаны прымаць удзел у перавыбарах. Даючы асаблівае заданьне на залучэньне ў перавыбары максімуму бядняцка-серадняцкіх пластоў, мелася на ўвазе необходнасьць павялічыць процант удзелу ў перавыбарах бядняцкіх, батрацкіх і серадняцкіх мас сяла, бо процант мінулага году лічыцца невыстарчальным. Усе перашкоды павінны быць пераможаны, і максімум, інакш—мажліва большы лік бядняцка - серадняцкага пласту сяла, павінен прыняць удзел у перавыбарах.

Трэцяе—«Строга сачыць за тым, каб устаноўленыя адпаведнай выбарчай інструкцыяй (1926 г.) нормы выключэньня з выбарчых сьпісаў кулацкіх і іншых супроцьпралетарскіх элемэнтаў праводзіліся як мага строга». Ня мы, інакш—не савецкая ўлада адціхнула ад сябе кулакоў і іншыя буржуазныя элемэнты, але яны самі выключылі сябе з саветаў, калі вялі змаганьне супроць саветаў. Цяпер кулацтва, нэпманская буржуазія, «былыя людзі» імкнуцца пралезьці ў саветы, каб прымушаць саветы служыць сваім інтарэсам, а не інтарэсам беднаты. Вось чаму трэба зорка сачыць за тым, каб не дапусьціць у саветы варожыя нам сілы.

Чацьвёртае—«Зьвярнуць увагу на залучэньне ў саветы сялянак і батрачак і на вылучэньне іх на кіраўнічую працу ў саветах». Гэта задача ў сёлетнім годзе ставіцца на першы плян, бо мінулыя гады паказалі, папершае, невыстарчальны процант удзелу жанчын у перавыбарах і, падругое,— зусім малы процант жанчын, выбіраемых у саветы, які з году ў год усё зьмяншаецца. Партыя лічыць, што асноўнай прычынай гэтых зьявішч трэба лічыць невыстарчальную ўвагу з боку мясцовых органаў да гэтага пытаньня. Трэба ўмець даказаць выбаршчыкам, што жанчына павінна ісьці ў саветы нараўне з мужчынай, што бяз удзелу жанчыны мы ня вырашым задач сацыялістычнага будаўніцтва, і што колькасьць жанчын на перавыбарах і ў саветах необходна падвоіць і патроіць.

Пятае—«Забясьпечыць кіраўніцтва партыі ва ўсёй перавыбарнай кампаніі». Трэба, каб у часе перавыбараў кіраўнічая роля кампартыі была ўсьвядомлена ўсімі выбаршчыкамі. За кім і з кім ісьці? За кампартыяй к новаму жыцьцю праз разьвіцьцё прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і культурнасьці ў горадзе і вёсцы, ці з цёмнымі сіламі контр-рэвалюцыі, кулакамі, папамі, «былымі людзьмі»? Вось пытаньне, якое павінна стаць ясна ў часе перавыбараў. Першы шлях—з ленінскай кампартыяй—шлях да зьнічэньня беднасьці, пякультурнасьці, клясавых супярэчнасьцяў. Другі шлях —без кампартыі, супроць кампартыі —шлях замацаваньня капіталістычных элемэнтаў гаспадаркі—пагне за сабою абагачаньне верхушкі, зьбяднеьне слабейшых, аднаўленьне экспляатацыі, прыгнечаньня, клясавай нацыянальнай розьні.

Зразумела, што для батрака, селяніна-бедняка і серадняка няма іншага шляху, апроч шляху, паказанага ленінскай партыяй.

Гэта акалічнасьць кладзе на мясцовыя партыйныя арганізацыі, асабліва на ячэйкі, найвялікшую адказнасьць. Уся дзейнасьць іх павінна быць пабудована так, каб узмацніць аўтарытэт кампартыі ў масах, каб бядняцка-серадняцкія слаі дабрахвотна ішлі за кампартыяй, выбіраючы кампартыю сваім кіраўніком. Адсюль выходзіць, што самым шкодным было паўтарэньне намылак мінулых гадоў, калі камуністы стараліся завуаліраваць ролю кампартыі, прыкрыць яе бесспартыйным пахрыналам.

Выпаўненьне ўсіх гэтых зазначэньняў XV зьезду павінна дапамагаць умацаваньню саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, як цэнтру палітычнага выхаваньня мас працоўнага селянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту. Дзякуючы гэтаму, мы зможам вырашыць тыя новыя задачы, што стаць перад нашай краінай і будуць з посьпехам ісьці па шляху да сацыялізму.

А. ЧАРВЯКОЎ.

Амэрыка ў фазе гаспадарчага крызісу.

ДЭПРЭСІЯ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ ГАСПАДАРКІ.—НАПЯРЭДАДНІ БІРЖАВОЕ КАТАСТРОФЫ. —РЭФАРМІСТЫ РАТУЮЦЬ КАПІТАЛІЗМ.

НЬЮ-ЁРК, 31-XII. Новагодзія пажаданьні палітычных дзеячоў і кіраўнікоў прамысловых колаў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў складзены ў звычайных аптымістычных выразах. Тым ня менш аўтары гэтых пажаданьняў ня могуць адхіляць росту прамысловае дэпрэсіі і сельска-гаспадарчага крызісу за апошніх некалькі месяцаў, хоць і «выказваюць надзею» на тое, што новы год унясе некаторае ажыўленьне ў эканоміку Злучаных Штатаў.

Агітацыя кіруючых колаў над левугам—«росквіт» востра не адчуваецца канкрэтнай сапраўднасьці. Буйнейшыя галіны прамысловасьці, уключаючы моталёвую, перажываюць сурёзную дэпрэсію. Беспрацоўе ніпухільна павялічваецца. У вугольных каналях ня спыняюцца забастоўкі, характар якіх можна параўнаць нават з адкрытаю вайною. Тэкстыльная прамысловасьць скарачае вытворчасьць і зьмяншае заработак. У выніку ўсеагульнае дэпрэсіі зьмяншаюцца таксама і прыбыткі ад чыгуначнага транспарту. Крэдыт, як і раней, вельмі распаўсюджан і грошы выдаюцца пад вельмі нізкі процант, што падахвочвае біржавую спэкуляцыю. У біржавых колах пагідаецца напружанасьць і ўсеагульнае чаканьне вялікіх подзей. Мяркуюць, што шмат якія трымацелі акцый, якія ўстрымліваліся да гэтага часу ад продажу паперы, каб не павялічыць агульнае сумы сваіх прыбыткаў за 1927 год і гэтым ухіліцца ад падаведнага павышэньня падатку, пасьля повага году адразу-ж выкінуць на рынак вялікую колькасьць акцый, што прывядзе да зьніжэньня курсу паперы і да біржавое катастрофы.

Асабліва трэба адзначыць становішча ў аўтамабільнай прамысловасьці, якую новы год застае ў перыядзе моцнае канкурэнцыі і ўнутранае барацьбы. У бліжэйшы час «Джэнэраль Матэрс» выпушчае некалькі новых мадэляў танных машын, спэцыяльна разьлічаных на канкурэнцыю з апошняю мадэллю Форда. У зьвязку з гэтай канкурэнцыяй чакаюць моцнага зьмяншэньня цэн на аўтамабілі. У працягу апошняга году ў часе падрыхтоўкі сваіх апошніх мадэляў Форд часова прыпыніў выраб. У сучасны момант як Форд, так і «Джэнэраль Матэрс» пагражаюць інтэнсыўным павялічэньнем выробу, а гэта няўхільна прывядзе да збытку ў вытворчасьці.

Што датычыцца амэрыканскае фэдэрацыі працы, дык яна зусім ня здольна справіцца з пасьляючым крызісам. Старшыня фэдэрацыі Трын агаласіў «новагодняя павіншаваньні» прадпрыемцам і публіцы, у якіх ён прапануе супрацоўніцтва між працаю і капіталам і пакорліва просіць прадпрыемцаў спыніць меры, пакіраваныя проці рабочых, і замірыцца з прафрухам.

Адзіная група, якая высоўвае становішча і наступаючую праграму як у галіне палітыкі, так і ў галіне эканомікі, гэта «Уркерс Парты».

ПОСЬПЕХ АПЭРАЦЫЙ ФЫНЬ-ЮЙ-СЯНА.

ШАНХАЙ, 31-XII. Афіцыйнае агенцтва нанкінскага ўраду Гемін паведамляе, што 28-га сьнежня войска Фын-Юй-сяна заняло Енчжоу-Фу на Цзян-Цзэсін—Пукоўскай чыгунцы ў правінцыі Шандунь. Войска генэрала Чжан-Цзэ-Ію нечаканы перайшло на бок паўднёвае армії.

Пасьпяна японскіх войск у Шандунь?

ШАНХАЙ, 30-XII. Грунтуючыся на чутках аб надыходзячай пасьпяне японскага войска ў Шандунь, усекітайская канфэрэнцыя кітайскіх гандлёвых палат зьвярнулася да Японіі з перасьцярогаю на ўмешваецца ва ўнутраныя справы Кітаю.

ЯШЧЭ 50 АХВЯР КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ.

ШАНХАЙ, 31-XII. Як паведамляе агенцтва Гозэн, 28-га сьнежня ў Хан-Яне ў часе мітынгу арыштавана больш 50-ці камуністаў. Сярод арыштаваных шмат жанчын.

РАСТРЭЛ 9-ЦІ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.

ШАНХАЙ, 30-XII. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў Конгмуне (на поўдзень ад Кантону недалёка станцыі Вампу) 26-га сьнежня расстраляна 9 рэвалюцыянэраў.

НОВЫ ЗАВАЯВАЦЕЛЬ КАНТОНУ.

ТОКІЁ, 31-XII. Водгук атрыманых тут вестак, Кантон заняты 7 корпусам, на чале якога стаіць Хуан-Сло-Сюн. Цэнтральны банк сыпіў апэрацыі з тае прычыны, што ўвесь рэзэрв банку захоплены войскам Хуан-Цзэ-Сяна, які выступіў у напрамку да Туншану.

Крызіс латвійскага ўраду.

Крызіс латвійскага ўраду цягнецца далей. Блёк пацменшасьцяў, які, пасьля няўдалых спроб іншых груп, атрымаў місію ўтварэньня ўраду, адмовіўся ад яе. Прэзыдэнт даручыў тады склаўшы ўрад нямецкай фракцыі, што мае мала шансаў. У палітычных колах гавораць аб магчымасьці роспуску сойму і назначэньні новых выбараў.

Карэспандэнт ПАТ ня ўпущан у Літву.

ВАРШАВА, 31-XII. Афіцыйнае «Польскае тэлеграфнае агенцтва» паведамляе: карэспандэнт польскага тэлеграфнага агенцтва, які атрымаў ад літоўскага прэм'ера Вальдэмараса візу на выезд у Літву, прыехаў сёньня раніцою на польска-літоўскую граніцу каля ст. Завязы, дзе, аднак, не зважаючы на тое, што ўсе необходныя фармальнасьці ім былі выкананы, літоўская пагранічная варта, грунтуючыся на інструкцыі з Коўні, адмовілася прапусьціць яго на літоўскую тэрыторыю.

Тав. Пахвалінскі на волі.

ЛЁНДАН, 30-XII. Агенцтва Рэйтар паведамляе з Ганконгу, што сюды прыехаў з Кантону генэральны консул СССР т. Пахвалінскі.

Пагроза арышту францускіх дэпутатаў-камуністаў.

ПАРЫЖ. Галоўны пракурор выдаў загад аб адшукэньні і арышце засуджаных за зьяваваньня ў вострае Кашэна, Дорыё, Марты Дуклё на падставе таго, што яны «не павінны знаходзіцца на волі ў часе перапынку між парляманцкімі сэсіямі».

Стан беспрацоўя ў Англіі.

ЛЁНДАН, 29-XII. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што лік афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у Англіі на 19-га сьнежня складаў 1.099900 чалавек, г. зн. на 25.323 чал. менш, чымся на мінулым тыдні і на 209.839 чал. менш, чымся на тэй самы дзень летась.

Перад новымі выбарамі ў Польшчы.

Магчымы левы блёк.

Між лявіцай ППС, камуністамі і народнай хлопскай партыяй вядуцца перагаворы аб перадвыбарным блёку. Як паведамляе „Глос Правды" лявіца ППС выйдзе з гэтага блёку, НХП і камуністы утвораць супольны выбарчы блёк.

Хістаньні лявіцы эндээраў.

На канфэрэнцыі эндээраў у Лодзі пастаноўлена ісьці разам з блёкам урадавых партый. У той самы час на зьезьдзе старшынь эндээраў у Грундзёндзе пастаноўлена выступіць з сваім уласным сьпіскам ва ўсіх паморскіх акругах.

Вітос пратэстуе.

Н. пасол сойму Вітос, аб якім газэты пісалі, што ён таксама перайшоў у лягер пахтрымліваючых урад партый, пратэстуе проці фальшывых паведамленьняў і кажа, што ні на етап зьмяніў сваіх адносін да ўраду і акцыі сэн. Бойкі.

Разлом сярод расейцаў.

У сувязі з надыходзячымі выбарамі расейцы, пражываючыя ў Польшчы, падзяліліся на 3 групы: 1) Расейскае народнае аб'яднаньне, 2) група, якая ідзе з блёкам меншасьцяў і 3) блёк «праваслаўных».

Расейцы проці украінцаў.

Гэтымі днямі, як паведамляе „Роботнік", на Вільні адбыўся зьезд, скліканы Расейскім Народным Аб'яднаньнем, на якім пастаноўлена змагацца з украінізацыяй праваслаўнай царквы. Урэшце пастаноўлена на выбарах галасаваць за расейцаў.

Сэнатар Уласаў творыць новую партыю.

«Кур. Віл.» паведамляе, што сэн. Уласаў мае намер выступіць з асобным выбарным сьпіскам у сойм і сэнат. Сьпісак гэты будзе сьпіскам беларускай лявіцы.

Справа блёку меншасьцяў у Віленскім ваяводзтве.

Гэтымі днямі адбылася ў Вільні супольная нарада сіністаў, мізрахістаў, гісахдуту і фелькістаў, на якой пастаноўлена ўтварыць супольны урэйскі блёк. Гэты блёк мае намер увайсьці ў блёк (буржуазны) усіх нацменшасьцяў.

Зьезды „Вызваленьня".

10 студзеня ў Вільні і Лідзе адбудуцца перадвыбарныя зьезды партыі «Вызваленьне», якое ў апошнія часы, на словах польскіх газэт, зусім страціла свае ўплывы ў З. Беларусі.

Канфіскацыя «Сялянскай Нівы».

№ 95 „Сялянскай Нівы" сканфіскована за перадвадзіну „Прадвыбарчыя ластаўкі" і «Навіны».

Зьезд украінскіх дэфэнзыўшчыкаў.

Гатымі днямі ў Львове адбыўся зьезд украінскіх дэфэнзыўшчыкаў, якія аб'яднаны ў партыю «Украінскі Народны Саюз». Зьезд падтрымаў поўную лояльнасьць саюзу і партыі ў адносінах да Польшчы.

Колькі выбаршчыкаў у Варшаве?

На апошніх выборах у колькасьці вы выбаршчыкаў выказваецца, што колькасьць выбаршчыкаў у сойм раўняецца 661424, а ў сенат 461498.

«Хрысьціянская думка».

Пасьля повага году стане выходзіць у Вільні новая каталіцкая газэта на беларускай мове, але лацінскімі літарамі, пад назвай «Хрысьціянская думка». Выдавець яе будзе кс. А. Ц[illegible]кевіч.

Беларуская мова ў каталіцкай дух. сэмінарыі.

Беларускі нац. камітэт у В[illegible] зьвярнуўся да віленскага каталіцкага арцыбіскупа з хадайніцтвам, у якім чыніць абавязкова патрэбным ув[illegible] беларускую мову у кат. дух. сэмінарыі ў Вільні.

Жонка і вера.

Былы міністр скарбу і вядомы палітычны дзеяч Зьдзехоўскі, па квацеры якога у мінулым годзе быў зроблен напад [illegible]мых польскіх афіцэраў, перайшоў з каталіцтва ў праваслаўе. Зразу гэта п. Зьдзехоўскі з набудзе рамантычных. Зьдзехоўскі захацеў разьвесьціся з сваёю жонкаю, каб нарэшце ажаніцца, але-ж у гэтым каталіцтва касьцёл яму адмовіў. Тады паўстала пытаньне, ці жонка, ці вера, якое п. Зьдзехоўскі вырашыў не на карысьць першай.

Новы кіраўнік віленскага куратэрыуму.

На месца звольненага з пасады віленскага школьнага куратэрыуму [illegible] назначан новы—С. Пов[illegible] на гэтай пары заніміў у [illegible]ме пасаду загадчыка агульнага аддзелу.

Сьвяточныя «катастрофы».

У часе сьвят, як зазначаюць не [illegible] ронії польскія газэты, здарыліся [illegible] катастрофы:

Тры ксяндзы выехалі з Варш[illegible] маходзе ў суседнюю парафію [illegible]ах. Па дарозе путамабіль [illegible] маху ў роў. Адзін ксёндз [illegible] фэр зьбіты. Два іншыя ксёндзы [illegible]

Пад Вымагродам абварыліся з сваімі роднымі таксама [illegible] мабілем у роў, пры гэтым [illegible] забіта, рошта асоб параненa. [illegible] аўтамабілем у роў, але [illegible] ня было.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў ФРАНЦУСКІМ ГАРНІЗОНЕ НА КОРСІЦЫ.

ПАРЫЖ, 30-XII. У дысцыплінарным батальёне Кальві на высьпе Корсіка адбываюцца непарадкі. 45 салдат, зьняволеных у дзьвюх каморах, прабілі сумежную перагародку, забарыкадаваліся і сьпяваюць інтэрнацыянал. З тае прычыны, што ўваход у каморы пагражае небясьпекаю сьмерці, месца зьняволеньня абкружана жандармэрыяй, на дапамогу якой прыслана войска з Баотэн.

ПАЎСТАНЬНЕ ПРЫДУШАНА.

ПАРЫЖ, 31-XII. Непарадкі ў дысцыплінарным батальёне ў Кальві на высьпе Корсіка прыдушаны. Як паведамляе агенцтва Гавас, пасьля таго, як былі выламаны дзьверы ў камору, дзе знаходзіліся паўстаўшыя, 10 з іх былі прызнаны кіраўнікамі і былі зьняволены ў адзінкавыя каморы, рэшта пасаджана ў астрог.

Водгук слоў «Юманітэ» вайсковае міністэрства мяркуе ўжыць сур'ёзныя рэпрэсіі да паўстаўшых.

«Юманітэ», грунтуючыся на лісьце аднаго з зьняволеных у Кальві ад 16-га сьнежня лічыць, што прычынаю паўстаньня паслужыла кепскае харчаваньне, а галоўным чынам, кепскія адносіны да зьняволеных.

ПЕРАМОГА ЛЯМОСКІХ ДРУКАРОЎ.

ПАРЫЖ, 31-XII. Забастоўка друкароў у Ліможы, якая распачалася 12-га сьнежня скончылася ў выніку ажыцьцяўленьня адзінага фронту частковаю перамогаю рабочых. Дасягнута згода, водгук якое пансія рабочым-мужчынам павялічана на 2 франкі, а жанчынам—на 1 франк 25 сантымаў.

Сялянскі бунт у Індакітаі.

ЛЁНДАН, 1-I. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што ў Бірме (Індакітай), ля Паунгды, сяляне напалі на паліцэйскі атрад, прычым сур'ёзна параніілі камандаваўшага атрадам афіцэра. Паліцыя страляла па сялянах, прычым забіла 2-х і параніла 5-х.

Водгук слоў агенцтва, насков сялян тлумачыцца ідэйна ўзьнікшым рухам проці выплаты падушных падаткаў.

Праўда ангельскіх рабочых аб СССР.

ЛЁНДАН, 31-II. Бюро даследаваньняў па рабочым пытаньні агаласіла сёньня справаздачу ангельскае рабочае дэлегацыі, наведаўшае СССР для ўдзелу ў сьвяткаваньні дзесяцігодзьдзя Кастрычніцкае рэвалюцыі. У гэтай справаздачы дэлегацыя адкрэсьлівае шырокі тэмп гаспадарчага будаўніцтва СССР, агульны дабрабыт жыхарства, між іншым, уздым дабрабыту сялянства, ажыцьцяўленьне прынцыпу нацыянальнае волі, разьвіцьцё ініцыятывы нага руху і г. д. Дэлегацыя таксама падкрэсьлівае, што рабочыя СССР усюды сустракалі яе з вялікім натхненьнем.

К-т таварыства прыяцеляў СССР у Францыі.

ПАРЫЖ, 30-XII. Канфэрэнцыя францускіх дэлегатаў, якая брала ўдзел у падарожжы ў Маскву на кастрычніковыя сьвяты, настанавіла заснаваць францускі камітэт таварыства прыяцеляў СССР. Ганаровымі старшынямі камітэту абраны Анры Барбюс, Франсыс Журдэн і Панаіт Істраці. З мэтаю азнаямленьня францускае інтэлігэнцыі з Савецкім Саюзам камітэт мяркуе выдаць брашуру і агаласіць маніфэст.

„Новагодні падарунак" ірляндзкім чыгуначнікам

ЛЁНДАН, 30-XII. Бюро заработку Ірляндзкіх чыгунак разгледзела патрабаваньне чыгуначных кампаній аб зьмяншэньні стаўкі заработку для нанова наймаемых служачых. Большасьцю галасоў бюро дазволіла зьменшыць заработак для новых служачых на 5-10 проц. у перавуньні з існуючымі стаўкамі.

Адпаведная пастанова ужо агалошана і набывае моц з 1-га студзеня.

Франка - амэрыканскія перамовы.

ПАРЫЖ, 31-XII. Агенцтва Гавас паведамляе: «Франка-амэрыканскія перамовы аб аднаўленьні і пашырэньні арбітражнага ўгавору, падпісанага ў лютым 1918 году, разьвіваюцца спрыяюча. Злучаныя Штаты разам з тым выказваюць гатоўнасьць распачаць з Францыяй перамовы з мэтаю падпісаць угавор, які абвяшчае вайну незаконнаю. Злучаныя Штаты ставяць умову, каб да гэтага ўгавору маглі далучыцца іншыя ўзяржавы».

Палёты Ліндбэрга па лацінскай Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 29-XII. Амэрыканскі лётнік Ліндбэрг прыляцеў з Мэксікі ў Гватэмалу. З Гватэмалым Ліндбэрг зробіць кругавы палёт па краёх цэнтральнае Амэрыкі, пасьля чаго вылятыць у Кубу. Прыезд Ліндбэрга ў Кубу, як думаюць, супадзе з адчыненьнем канфэрэнцыі пан-амэрыканскага саюзу, назначанае на 16-га сьнежня.

Палёты Ліндбэрга вырабляюць [illegible] стоўваюцца амэрыканскай [illegible] з мэтаю павялічыць [illegible] ночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у лацінскай Амэрыцы.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ АПАЗІЦЫЯНЭРАЎ СА СКЛАДУ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ЦВК СССР.

МАСКВА, 2-I. Заслухаўшы заяву фракцыі УсеКП(б), прэзыдыум ЦВК СССР ад 30 сьнежня аб адкліканьні са складу членаў, а таксама кандыдатаў ЦВК СССР Белабародава, Зіноўева, Ішчэнка, Каменева, Ракоўскага, Сьмірнова, Троцкага, Каспаравай, прэзыдыум ЦВК СССР ухваліў выключыць пералічаных асоб са складу членаў, а таксама кандыдатаў ЦВК СССР.

БОЙКІ Ў РАЙЁНЕ ЎСХОДНЯЙ РЭЧКІ.

ШАНХАЙ. У райёне Хаюэна на Ўсходняй рэчцы адбываецца бойка між 4-ай арміяй Чан-Фа-Гуя і сватоўскім войскам. На баку арміі Чан-Фа-Гуя змагаецца кантонскі флёт. У райёне Ўсходняй рэчкі адбываецца бой між трыма арміямі—сватоўскай, арміяй Чан-Фа-Гуя і «Чырвонай арміяй».

КАТАСТРОФА НА ЧЫГУНЦЫ.

ТЫФЛІС, 2-I. На перагоне Кабулеці-Чаква на поезд з нафтапрадуктамі, ішоў у Батум, абвалілася глыба зямлі. Абвалам быў перакінут цягнік. У часе ўзьнікшага пажару згарэла 27 цыстэрн з нафтай і бензінай. Прыбыўшым з Батуму пажарным камандам удалося ліквідаваць пажар. К месцу катастрофы паслана некалькі дапаможных паязду, якія працуюць на расчыстцы дарогі.

За дзень.

Сацыялісты пана Пуанкарэ.

Гэтымі днямі засядаў зьезд францускай сацыялістычнай партыі. Жэнэўскі герой Поль Бонкур, прадстаўнік Францыі ў Лізе Нацый, ён-жа выдатны лідэр францускіх сацыялістаў казаў: «Усякія гутаркі аб бездакладнай эвакуацыі Рэйну зьяўляюцца гэткай жа бясэнсіцай, як і гутаркі аб бездакладным разброеньні». Гэтая цынічная заява лепш усяго характарызуе палітыку і адносіны францускіх сацыялістаў да пытаньня аб вайне, аб якой зараз столькі гаворыць нават буржуазная замежная прэса. Пуанкарэ можа ганарыцца «сваім» сацыялістам. Ён бы ўласна нічога больш Бонкура не сказаў-бы.

Куды было зьезду сацыялістаў займацца надобнага роду пытаньнямі, як аб ваеннай небясьпецы. Амаль усе пасяджэньні зьезду былі заняты спрэчкамі аб надыходзячых выбарах у парлямант.

Парляманцкія махінацыі для ашуканьня мас цікавяць Рэнэдэля і Блюма ў тысячу разоў больш, чымся які небудзь практычны крок у барацьбе за сапраўднае палепшаньне становішча рабочых мас. Аб чым спрачаліся «правыя» і «левыя» на зьезьдзе? Галоўным чынам аб тым, каго [illegible] паўторнага [illegible] на чале левага блёку і пасьля перадалі ўладу Пуанкарэ. Але гэты выпадак мала чаму навучыў францускіх сацыялістаў. Прапановы францускай камуністычнай партыі аб супольным выступленьні на выбарах меншавікамі адхіляюцца. Зьездам прынята згодніцкая фармулёўка, якая быццам здавальняе абодвы бакі, але фактычна дае перамогу правым элемэнтам. Меншавікі пры паўторных галасаваньнях у кожным паасобным выпадку будуць аддаваць свае галасы той партыі, за якою будзе відавочная большасьць, але не рэакцыянэрам.

Зусім ясна, што фактычна гэта дасьць магчымасьць меншавікам цалкам падтрымаць радыкалаў на выбарах і праводзіць іх кандыдатуру.

У Францыі стварыліся гэткія абставіны, якія дапамагаюць палепшэньню рабочага руху і рэвалюцыяізаванасьці рабочых мас. Гэта навіна ўлічыць камуністычная партыя Францыі, якая яшчэ большай мобілізацыяй працоўных мас разаб'е ашкрчы блёк францускіх меншавікоў.

„Незалежная дзяржава" Ірак.

Ангельская мандатная тэрыторыя Ірак, на якую Англія мела ўгавор на 25 гадоў, гэтымі днямі падпісала новы ўгавор. Згодна гэтага гэтаму ўгавору Англія афіцыйна пібы [illegible] у 1932 годзе, калі Англія бярэ на сябе абавязак абаранаць кандыдатуру Іраку ў правадзейныя члены Лігі Нацый. Апрача таго і да 1932 году пасьля гэтага тэрміну незалежнасьць Іраку ў значнай меры абмяжоўваецца заходта шырокімі правамі, якія падаюцца камісару брытанскага караля.

Як далёка пойдзе гэтая «незалежнасьць» ужо відаць з таго, што король Іраку Фэйсал, які патрабаваў увесьці ўсеагульную вайсковую павінасьць, адразу-ж адмовіўся ад сваіх патрабаваньняў, як толькі ангельскі дэлегаты адкатуль заявілі свой пратэст. Ірак па ранейшаму будзе знаходзіцца пад «абаронаю» брытанскіх узброеных сіл і камандаваньне іракскае арміі будзе падначалена ангельскай вайсковай місіі. Іракскае насельніцтва і ў далейшым штогод будзе плаціць каля 10.000.000 руб. у [illegible] падатку на «абарону Іраку».

Гэткім параднам новы ўгавор [illegible] Англіяй і Іракам нічога повага [illegible] ўносіць. Фактычна Ірак і ў дал[illegible] застанецца ангельскай калёніяй.

Чым-жа выклікана падпісан[illegible] нага ўгавору? У Іраку, гэтакс[illegible] і ў Эгіпце, нацыяналісты [illegible] да сапраўднай незале[illegible] яшчэ ня ўступілі [illegible] га паўстаньня, а[illegible] кампанію сур[illegible] зьяўленьня [illegible] імпэры[illegible]

Слова за 1928 годам.

Пяма больш пяжкай і найдзячнай задачы, як спроба ў канцы каляндарнага году падвесьці нешта накшталт палітычнага балянсу. Дыялектыка сусьветнай гісторыі зусім ня лічыцца з тымі абмежаванымі рамкамі, якія стварае каляндар. Але наш Савецкі Саюз, першая ў сьвеце дзяржава працоўных, якая базуецца знаходзіцца ў капіталістычным акружэньні, абавязан нават у тых абмежаваных рамках зрабіць спробу аналізу мінулых падзей, спрабаваць падагуліць цэлы шэраг падзей нядаўняга мінулага, ня гледзячы на іх супярэчнасьць.

Возьмем асноўныя моманты першае паловы мінулага году. З аднаго боку разрыў Англіі з Савецкім Саюзам, з другога—удзел Савецкага Саюзу ў міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі. Першая падзея быццам абвяшчае ўсяму сьвету, што эпоха мірных дыпляматычных дачыненьняў паміж рабочаю дзяржаваю і буржуазнымі дзяржавамі скончылася. Другая, якая адбылася адначасова з першай падзеяй, дзіўна з ёю пераблытваецца, дае сьвету фармулу «саіснаваньне Савецкага Саюзу з капіталістычнымі краінамі». Фармулу гэту дала наша дэлегацыя ў Жэневе на сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, але яна-ж была адобрана грамадзкай думкай шэрагу кіруючых дзяржаў і некаторымі ўрэдамі. Здавалась-бы перад намі вялізарная супярэчнасьць. Між тым абедзьве падзеі выяўляюць адну тэндэнцыю. Сучасныя дзяржавы не выяўляюць той рыцарскай шкетнасьці, якую выказваў расейскі цар даўно мінулых часоў, які гаварыў «Іду на вы». Чым больш сьпешыхтуюцца сучасныя імпэрыялісты на вайны, тым больш умарта гаворадь у дыпляматычных канцэлярыях і міры.

Возьмем нават апошнія тыдні і месяцы мінулага году: удзел Савецкага Саюзу ў новай міжнароднай канфэрэнцыі (па разброеньню) і крывавая справа брытанскіх «заплечных дел мастеров» у Кантоне. У Жэневе быццам шукаюць спосабу вырашыць становішча, якое намінуча павінна прывесьці да новай сусьветнай вайны, а на адлегласьці некалькіх тысяч кілёмэтраў ад канфэрэнцыі ат ляў на Жэнэўскім возеры акцыя, разлічаная, бясспрэчна, на тое, каб нанесьці «фляндаўны» ўдар вялікай рабочай дзяржаве шляхам прыдушэньня вызваленчага руху Кітаі. Абедзьве акцыі, жэнэўская і кантонская, дапаўняюць адна другую. Першая сьведчыць аб тых супярэчнасьцях, у якіх жыве і якіх ня можа зьнішчыць капіталістычны сьвет, другая паказвае, які ён прадбачыць выхад з гэтага становішча.

Для нас 1927 г. быў, перш за ўсё, годам шпаркага нарастаньня супярэчнасьцяў паміж капіталістычным сьветам і савецкаю дзяржаваю і—рашаючым фактам —годам пераходу гэтых супярэчнасьцяў з стадыі добра прыхаванага «нармальных» узаемаадносін у стадыю адкрытага. Гэта—перамога пры ўсякай зацяжнай перспэктыве капіталістычны-ж сьвет даўно ўжо паяўнасьць на адной шоссейнай кулі савецкае дзяржавы. Яўляецца хваробай, якую можаць, калі яма іншых сродкаў і хірургічным спосабам.

Ацэнку мінулага году зрабіць цяжка. За некалькі дзён перад Новым таксама падагуліў яго вынікі (у гутарцы з вядомым французкім журналістам Зауэрвейнам). Пасьля ўводнай казённай фразы аб посьпехах сусьветнай палітыкі Брыян усё-ткі вызначае, што «мы амаль локцем закранулі вялізарныя небясьпекі і не адзін раз павінны былі ўважліва спыніцца на тым, што ў Эўропе не дасягнута ўстойлівага становішча, якое дало-б магчымасьць дзяржаўным дзеячом адначасова на лаўрах. Маюцца раны, якія ... не загоены, адны народы ... за сваю бясьпаснасьць і імкнуцца да экспансіі, а другія зусім выразна выяўляюць трывогу».

Кароткі сэнс гэтага дыпляматычнай і ... ткі вельмі адкрытай фразы на нашым ... завецца фармулай аб налаўці ... імпэрыялістычных супярэчнасьцяў, сума якіх, дадамо мы, усе-ж невыстарчальна, каб зьменшыць асноўную супярэчнасьць паміж усім капіталістычным сьветам і намі. І гэтыя супярэчнасьці выяўляюцца больш выразна таму, што наша палітыка міру, наш гаспадарчы рост цьвердa ставіць перад усім сьветам «расейскае пытаньне».

Які з этапаў сусьветнай палітыкі за мінулы год мы ні возьмем, ці пытаньні агульнага парадку міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі і канфэрэнцыі па разброеньню, ці гэткі прыватны канфлікт, як збавастраньне польска-літоўскіх узаемаадносін,—усюды мы воляю гісторыі прымушаны ставіць балючыя для капіталістычнага сьвету „карэнныя" пытаньні. Толькі нашымі посьпехамі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва мы выклікаем «рух» народных мас, іншымі словамі, набліжаем момант рэвалюцыі.

Зьмена ўраду ў Прыбалтыцы (Эстонія і Латвія), новы ўрад у Фінляндыі (няхай сабе зьмена дэкарацыі і адбывалася з прычыны, галоўным чынам, унутранай палітыкі),—ня могуць не прыцягнуць нашай увагі ў тым самым кірунку, як і падзеі ў Кітаі, англійскі разрыў і г. д. Гэта ўзмацненьне ўпливу на нашых межах зьяўляецца вельмі паказальным. Маленькія дзяржавы раўнаюцца па пэўнай баявой лініі па загаду старшых камандзіраў, ня лічачыся з інтарэсамі сваіх уласных краін і прыслухоўваюцца толькі да «кірунку гісторыі».

Але з другога боку, захаваньне нармальных узаемаадносін з іншымі вялікімі дзяржавамі, у першую чаргу з Францыяй, дзе пасьля адкліканьня Ракоўскага нібы зьнішчан насьпяваючы канфлікт, разьвіцьцё эканамічных зносін з Італіяй і прыяцельскіх адносін з Нямеччынай, Японіяй і г. д.—усё гэта даводзіць, што перагрупоўка палітычных сіл пад кіраўніцтвам Англіі яшчэ ня скончылася (гэта-б азначала вайну!), а толькі пачалася ў мінулым годзе. Гэта значыць, што 1927 г. ня быў годам, вырашаючым пабудову новай сусьветнай бойкі, а толькі інкубатарам пэўных тэндэнцый.

Бо з дыялектыкі сусьветнай палітыкі нельга браць асобныя моманты і разглядаць іх як нешта цьвёрдае. Напрыклад, франка-савецкія ўзаемаадносіны, якія можна разглядаць толькі з пункту гледжаньня агульнага міжнароднага становішча Савецкага Саюзу. Але ці можна пры гэтым забывацца і ці ня трэба непасрэдна за першай праблемай спамянуць і другую, праблему франка-італьянскага супаборніцтва ў яе спалучэньні з палітыкай Англіі? Можна і трэба са здаволеньнем гаварыць аб разьвіцьці прыяцельскіх, палітычных і эканамічных узаемаадносін з Нямеччынай. Але ці можна разглядаць іх як нешта асобнае ад агульнага становішча Нямеччыны, ад вялікага клубка рэпарацыйнай праблемы, іменна ў мінулым годзе, калі яна выявілася ў новым выглядзе (справаздача Джыльберта!). І нарэшце, пытаньне аб польска-савецкіх дачыненьнях, якія знаходзяцца ў шчыльнай сувязі з цэлым шэрагам памянёных праблем: ці можна яго аддзяліць ад гэтага клубка?

Міжнародны буржуазны друк у сваіх навагодніх аглядах, мабыць будзе ставіць і вырашаць пасвойму пытаньне аб тым, пагоршылася ці палепшылася міжнароднае становішча Савецкага Саюзу. Шукаць адказу на пытаньне ў гэткай устаноўцы — дарэмная спроба. Калі ўжо падагульваць вынікі каляндарнага году, дык толькі з пункту гледжаньня спробы вывяць па ўсёй суме дыялектычна разнастойных, але па сутнасьці паміж сабой падобных падзей на міжнароднай арэне, куды мы, уласна, ідзем—мы, уся рабочая кляса, а ня толькі СССР.

І на гэткае пытаньне мы можам, падводзячы баланс мінулага году, адказаць: калі міжнароднаму пралетарыяту і яго баявому авангарду, рабочай дзяржаве (першай—сваім рэвалюцыйным рухам, другой—яе мірнай палітыкай савецкага ўраду), ня ўдасца ліквідаваць ачагі вайны, дык новая крывавая бойня нямінуча. Але на пытаньне, дзе і калі, мінулы год канчатковага адказу ня даў. Слова за 1928 г.

У Саюзных Рэспубліках.

РАЗВАЛ АПАЗІЦЫІ.

Групавыя заявы аб адыходзе ад апазіцыі.

ТЫФЛІС. У Кутаіскі павятовы камітэт КП Грузіі падвядзена заява ад васьмі ранейшых апазіцыянэраў аб адыходзе ад апазіцыі і далучэньні да пастаноў 15 партыйнага зьезду.

* * *

АДЭСА. У кантрольную камісію паступілі лісты ад трох апазіцыянэраў аб адыходзе ад апазіцыі.

Адзін з іх Зільбэрштэйн паведамляе, што напярэдадні 15 зьезду ў Адэсу прыехаў Сафараў і наладзіў на пасяджэньні апазіцыйнага цэнтру даклад аб далейшай тактыцы апазіцыі. Асноўныя думкі дакладчыка: патрэбна павялічыць збор подпісаў пад платформаю апазіцыі і разгледаць подпісы, як французкіяны білет; далейшыя ня чаго саромацца партыйнае арга ізацыі і патрэбна адкрыта заяўляць аб фракцыйнай працы і інш.

* * *

АДЭСА. Бюро акруговому разглядала справу саміх камсамольцаў, якія абвінавачваліся ў раскольніцкай працы. Тры падалі заяву аб адыходзе ад апазіцыі і пакінуты ў камсамоле, рэшта выключана.

* * *

СЬВЯРДЛОЎСК. 27 апазіцыянэраў з Уфалейскае арганізацыі Сьвярдлоўскае акругі падалі заяву аб адыходзе ад апазіцыі. Ранейшыя апазіцыянэры заяўляюць аб поўным разброеньні і здачы нелегальнае літаратуры. Яны здымаюць подпісы з дакумантаў апазіцыі і распускаюць фракцыю.

Бакінскі партактыў аб працы XV зьезду.

БАКУ, 1 I. Пашырэны актыў бакінскае партарганізацыі, заслухаўшы даклады аб выніках XV партзьезду, адназгодна ўхваліў рэзалюцыю, у якой зазначана: «Актыў бакінскае арганізацыі цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастаноў зьезду аб выключэньні лідэраў апазіцыі з партыі і да пастаноў аб пяцігадовым плане народнае гаспадаркі, аб працы на вёсцы і іншых пытаньнях. Актыў дамагаецца, каб далейшая праца апазіцыі на чале з Троцкім перасякалася партыяй з усёю рашучасьцю, усімі сродкамі, якія толькі ёсьць у загадзе пралетарскай дзяржавы.

Актыў бакінскае арганізацыі прапануе бакінскаму камітэту і ЦКК КП Азэрбайджану ўжыць неадкладна захады да ажыцьцяўленьня пастановы XV зьезду ў адносінах да трацкісцкіх апазіцыянэраў, якія знаходзяцца яшчэ ў радах бакінскае арганізацыі.

Замець.

КАЗАНЬ. Увесь апошні тыдзень стаіць моцная мароза, дасягаючыя 30-35 градусаў. Часта позьняцца паязды.

АРМАВІР, 1-I. Другі дзень—страшэнная сьнежная завея. На чыгунцы заносы. Паязды позьняцца.

НОЎГАРАД, 1-I. У раёне станцыі Любань Акцябрскае чыгункі вялікія сьнежныя заносы, якія затрымліваюць рух паездоў на Маскву і Ленінград.

План усеагульнага навучаньня ў РСФСР.

МАСКВА. Калегія НК Асьветы зацьвердзіла плян усеагульнага пачатковага навучаньня ў РСФСР. Плян разьлічан на 5 гадоў. У першым 1927-28 навучальным годзе школа павінна ахапіць 71,1 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту, у 1928-29 г.—80,4 проц., у 1929-30 г.—84,2 проц., у 1930-31 г.—88 проц., у 1931-32 г.—90,9 проц., у 1932-33 г.—93,9 проц. і да канца пяцігодкі 1933-34 г.—97,1 проц. На ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня патрэбна 2.758 міліёнаў рублёў. Плян перадасцца на зацьверджаньне вышэйшых урадавых органа.

Разьвіцьцё цывільнае авіяцыі.

МАСКВА. ТДА-Авіяхім выказаўся за ўвядзеньне ў пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР праграмы разгортваньня цывільнае авіяцыі, а таксама аб яе фінансаваньні. Прызнана мэтазгодным арганізаваць новыя паветраныя лініі, злучаючы СССР з Манголіяй, Пэрсіяй, Аўганістанам, Турцыяй, Кітаем, Японіяй, Латвіяй і Нямеччынай, а таксама транс-кантынэнтальныя лініі Масква—Закаўказьзе, Масква—Далёкі Ўсход, Масква—Сярэдняя Азія. Прызнана неабходным злучэньне «Добралёту» і «Укрвоздухпути» у адзінае ўсесаюзнае таварыства паветраных зносін, аэра-фота здымкі і барацьбы са шкоднікамі.

Конкурс гарманістаў у Маскве.

МАСКВА. У нядзелю 1-га студзеня у Калённай залі Дому Саюзаў адчыніўся другі маскоўскі губэрскі конкурс гарманістаў. У журы конкурсу: т. т. Луначарскі, Іпалітаў-Іваноў, Паляноўскі, Ірма Яўпэм, трыё гарманістаў тэатру Мэйерхольда і прадстаўнікі музычных і грамадзкіх арганізацый.

Адчыняючы конкурс, сэкратар МК ЛКСМ т. Косараў адзначыў валічэзныя дасягненьні гармоніка з часу першага конкурсу. Па Савецкім Саюзе адбылося 2.500 конкурсаў, у якіх удзельнічала 30 тысяч гарманістаў. З міліёны слухачоў перабывала на конкурсах. Гармонік карыстаецца посьпехам. Ён павінен стаць сродкам культурнага разьвіцьця шырокіх гушчаў працоўных. З прывітаньнем ад Наркамасьветы выступіў т. Луначарскі.

У першы дзень конкурсу выступіла 30 гарманістаў.

Сьмерць нарадавольца.

МАСКВА, 28-XII. 28 сьнежня ў Маскве сканала ад крупознага запаленьня лёгкіх член партыі народнае волі Наталля Язэпаўна Коган-Бернштэйн.

Савецкая ялавічына на заграніччных рынках.

АДЭСА, 28-XII. Посьпех першае пасылкі марожанага мяса ў Францыю і Італію адзначаюць усе заграніччныя фірмы. Мяса аказалася лепшым за канадзкае.

Коні з заграніцы.

МАСКВА. Гэтымі днямі ў Маскву прывозіцца новая партыя племянных коняй, закупленых Наркамземам у Францыі і Бэльгіі для дзяржаўных конных заводаў і стайняў: 42 цяжкавозы-правансоны і 18 чыстакроўных скакуноў.

Ваўні ў Крыме.

СЕВАСТОПАЛЬ. У ваколічных вёсках пачуваны наплыў ваўкоў. Страты, учыненыя імі, вялікія. За апошнія 15 гадоў ваўкоў у Крыме амаль што ня было.

Да XI-га тыражу выйгрышаў 1-й Дзяржаўнай Выйгрышнай Пазыкі 1922 году.

З 2-га да 6 студзеня г. г. у гор. Туле адбываецца XI тыраж выйгрышаў 1-й дзяржаўнай 6-цідроц. залатой пазыкі 1922 г.

Выйгрышная пазыка 1922 г. была выпушчана ў перыяд, калі ў краіне ня было прадпасылак для разьвіцьця дзяржаўных крэдытных апэрацый, г. зн.: натуральная гаспадарка, надзвычайная вышыня прыватнага дыскоўнту, падаючая валюта, адсутнасьць зьберажэньняў і г. д.

Стымулам набыцьця аблігацый гэтае пазыкі павінны былі служыць ня столькі выгады самае пазыкі, колькі зацікаўленасьць насьленьня ў мерапрыемствах, падрыхтоўваючых увядзеньне ўстойлівае валюты і магчымасьць застрахаваць свае зьберажэньні ад падаючай валюты, шляхам зьмяшчэньня іх у аблігацыі пазыкі, выпушчанай у залатой валюце.

Умовы выпуску 1-й дзяржаўнай пазыкі прадугледжвалі наступны парадак тыражоў выйгрышаў: з 1923 г. да 1927 г. уключна—навінна было адбыцца па два тыражы выйгрышаў штогод на суму—800.000 р. у кожным і з 1928 г. да 1930 г. уключна па адным тыражу штогод на суму 700.000 р. у кожным. У гады 1931 і 1932 г. тыражоў выйгрышаў праводзіць не прадугледжвалася.

Імкнучыся не паслабіць зацікаўленасьць трымальнікаў да пазыкі і на будучы час, ЦВК і СНК СССР 21-га мая 1927 г. пастанавілі павялічыць на час 1928 г. да 1930 г. уключна колькасьць тыражоў па аблігацыях дзяржаўнай 6-ці проц. пазыкі 1922 г. з аднаго да 2-х штогод, а таксама ўстанавіць у 1931 і 1932 г. г. па два тыражы выйгрышаў штогод. Правядзеньне памянёных тыражоў назначана на 2-га студзеня і на 1 ліпеня кожнага году.

Агульная сума, якая падлягае розыгрышу ў кожным з гэтых тыражоў, вызначана ў разьмеры 800.000 руб.

Такім чынам, замест прадугледжанага ў 1928 годзе аднаго розыгрышу будзе праведзена два, а агульная сума выйгрышаў павялічваецца з 700 тысяч да 800 тысяч руб.

Па колькасьці і разьмерах выйгрышы разьмяркоўваюцца наступным чынам: 1 выйгрыш—100.000 руб., 1 выйгрыш—50.000 р., 2 выйгрышы па 25.000 р., 5 выйгр. па 10.000 р., 10 выйгр. па 5.000 р., 50 выйгр. па 1.000 руб., 100 выйгр. па 500 руб., 1.000 выйгр. па 100 руб., 2 000 выйгр. па 50 руб. і 10.000 выгр. па 20 руб.

А. Львоў.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Торфараспрацоўкі на Бабруйшчыне.

Бабруйск. Торфараспрацоўкі на Бабруйшчыне—справа новая, ня маючая яшчэ свайго шырокага разьвіцьця, а галоўнае, практычнага ўжываньня. Ужываньне торфу як апалу, мала яшчэ распаўсюджана, што, вядома, мае кепскі ўплыў на разгортваньне распрацовак.

Але ўсёж на сёнешні дзень Бабруйская акруга налічвае 14 сялянскіх таварыстваў па распрацоўцы торфу. Праца гэтых таварыстваў праходзіць пакуль што вельмі марудна. Распрацоўкі праводзяцца ручным спосабам, таварыствы стаяць перад пытаньнем адсутнасьці збыту торфу. Дзяржаўныя прадпрыемствы і ўстановы таксама мала пакуль што карыстаюцца тарфяным апалам. Толькі камунальны трэст у бягучым годзе распрацаваў 10 тысяч кубічных мэтраў торфу для сваіх прадпрыемстваў.

Агульная-ж дабыча торфу на акрузе раўняецца 16 тыс. куб. мэтраў. Вядома, лічба гэтая невялікая і патрабуе павялічэньня.

Меркаваньні да практычнага пашырэньня гэтай справы ўжо ёсьць. Так па акрузе праводзіцца належная падрыхтоўка да арганізацыі новых таварыстваў па торфараспрацоўках.

Апрача таго, яяркуецца перавод некаторых савецкіх гаспадарак на тарфяны апал. 4 саўгаспадаркі распачынаюць на сваіх балотах распрацоўку торфу для сваіх патрэб.

Побач з гэтым у хуткім часе разпачнуцца дзяржаўныя распрацоўкі торфу На кісялевіцкім балоце будуецца вялікі тарфяны завод агульнадзяржаўнага значэньня.

Усе гэтыя мерапрыемствы ... пашыраць распрацоўку ... Але побач з гэтым ... аддаць больш увагі ... ўжываньня ... мае выпадак, ... ства ў ... распрацоўцы ... збыту ... ў адзін дзень ... най рукі.

А побач з гэтым ... дробныя прадпрыемствы ... вающа пакуль што дрывамі. Дый такіх выпадкаў шмат.

Зьява гэта ненармальная і зьнішчэньне яе паслужыць штурхачом для шпаркага разьвіцьця торфаздабываньня.

А. Дамброўскі.

Дзе актыўнасьць, там і карысьць.

Гарадзецкае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства да 1927 г. усяго мела 20 проц. каапераванага насельніцтва і 1365 р. 5 к. крэдыту.

Цяпер-жа за адзін 1927 бягучы год, дзякуючы ўпартай працы і актыўнасьці старшыні таварыства, яно ўзмацнела і павялічылася на 10 проц. каапераванага насельніцтва і на адно насёнаводнае т-ва. Акрамя пакрыцьця дэфіцыту мінулага год—1358 р. 5 т-ва мае чыстага прыбытку 1178 18 кап.

Адсюль бачым, што можна пры актыўнасьці і шчырай працы. Вось чаму на якія хутка адбудуцца, гэтнікам-упаўнаважаным месц ... каб у таварыстве неадрыгнуло было да 1927 г. Пракоп Хільв...

Да ўсеагульнага навучаньня.

Бабруйск 2-I. Інспэктарыят народнае асьветы зараз апрацоўвае плян усеагульнага навучаньня ў акрузе. Для ахопу дзяцей школьнага ўзросту шырока будзе разгорнута школьная сетка.

У 1928-29 годзе будзе адчынена 113 новых камплектаў у 1929-30 г.—134 камплекты, у 1931-32 г.—142 камплекты і г. д. Такім чынам, па ўсёй акрузе ўсеагульнае навучаньне будзе ўведзена толькі праз 7 год. (У 1934-35 годзе). У гарадох Бабруйску і Слуцку, а таксама і пагранічных раёнах усе дзеці школьнага ўзросту будуць цалкам ахоплены школай праз 3 гады.

ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Гомель, 2-I. За мінулы год жыльлёвая кааперацыя затрацила на будаўніцтва 984569 руб. Пабудавана 3 мураваныя дамы на 82 кватэры і 78 драўляных на 179 кватэр. Дабудавана ніскончаных раней 61 драўляны дом на 126 кватэр. Сёлета будзе пачата пабудова ў Гомелі 2 вялікіх мураваных дамоў: адзін на 100 кватэр, другі на 50.

1750 ЯШЧЫКАЎ ЗАПАЛАК.

Гомель, 2-I. Заводакіраўніцтва фабрыкі «Везувій» пачало працу па паступовай дагрузцы фабрыкі. З готавай мэтай устанаўліваюцца некаторыя станкі. У канцы студзеня фабрыка будзе вырабляць 1750 яшчыкаў запалак.

ПАБУДОВА АКРУГОВАЙ ВЭТЭРЫНАРНАЙ ЛЯЧЭБНІЦЫ.

Бабруйск, 2-I. У Бабруйску распачата пабудова ветэрынарнай лячэбніцы акруговага значэньня. Лячэбніца разлічана на 10 аддзяленьняў па відах хваробы жывёлы. Сёлета будуць скончаны будаўнічыя работы.

ЭПІДЭМІЯ СЬВІНКІ.

Бабруйск, 2-I. За апошні час сярод дзяцей значна пашырылася эпідэмія сьвінкі. У сьнежні месяцы зарэгістравана 30 выпадкаў гэтае хваробы. У аднэй гарадзкой школе захварэла 18 дзяцей. Інспэктарыятам аховы здароўя прыняты належныя меры для барацьбы з эпідэміяй.

ПЕРАВЫБАРЫ Ў МАЛОЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Бабруйск, 2-I. Пачаліся перавыбары праўленьняў малочнай кааперацыі. На справаздачна-перавыбарных сходах прысутнічае ад 50 да 70 проц. пайшчыкаў. На сходах наглядаецца вялікая актыўнасьць. У спрэчках, галоўным чынам, узьнімаюць пытаньні аб узмацненьні завозу канцэнтраваных кармоў, аб арганізацыі злучных пунктаў пры арцелях, а таксама аб паляпшэньні збыту малочных прадуктаў.

МАЛОЧНЫЯ КУРСЫ.

Віцебск, 29-12. 10-га студзеня ў Віцебску адчыняюцца 6-хтыднёвыя курсы для перападрыхтоўкі і падрыхтоўкі майстроў масларобства і сыраварэньня. Курсы разлічаны на 55 чалавек.

Работы на Асінстроі ў 1926-27 годзе прайшлі здавальняюча.

(Інфармацыя галоўнага інжэнэра Асінстрою тав. Алейнікава на прэзыдыуме ВСНГ).

У суботу, 31 сьнежня, прэзыдыум ВСНГБ заслухаў даклад інжэнэра Алейнікава аб ходзе работы на Асінстроі. З дакладу відаць, што ўмовы працы ў 1926-27 годзе былі ня зусім спрыяючыя. Да арганізацыі будаўніцтва было прыступлена вельмі позна (з мая). Гота не дало магчымасьці падрыхтаваць патрэбны апарат, закупіць матар'ялы і забясьпечыць рабочых жыльлём.

Першай задачай будаўніцтва было падрыхтавацца да магчымасьці разгарнуць работы па будаваньні станцыі ў наступным 1927-28 годзе. Прыступіць да капітальных работ у 1926-27 годзе ня было магчымасьці, бо першае асыгнаваньне ў 800 тысяч рублёў па бюджэту БССР было невыстарчальнае, і, апроч таго, па месцы пабудовы галоўнага корпусу трэба было рабіць дадатковыя досьледы.

Такім чынам, па сэзон 1927 году былі вызначаны наступныя работы: рамонт Выдрацкага пасёлку, пачатак пабудовы жылых дамоў у Арэхах, падрыхтоўка балот, рамонт жылых дамоў на торфазаводзе, заказы на торфамашыны, рамонт чыгуначнай калянінны Хлюсьціна-Выдрыца, пачатак пабудовы чыгункі Выдрыца-Арэхі, пабудова шашы ад вёскі Грышаны да Арэхаў, заказы на турба-генэратары і катлы, абсталяваньне часовай станцыі і інш.

Усе гэтыя работы былі ацэнены ў 1.640.070 рублёў, пры магчымасьці расходаваць гатоўкаю 1.152.187 руб. Пры перагляде гэтага каштарысу аказалася, што некаторыя работы недаацэнены, а некаторыя зусім ня ўключаны ў каштарыс. Вышла, што трэба дадаць 99.000 рублёў звыш генэральнага каштарысу. Аднак, будаўніцтва Асінстрою мяркуе, што дабаўляць ня прыдзецца, бо можна будзе патаньніць пабудову некаторых будынкаў і зэканоміць на капітальным абсталяваньні. Апроч таго, будзе пакрыта частка расходаў пасьля рэалізацыі маемасьці Асінстрою (часовая станцыя, рабочыя машыны і інш.).

Рабочых працавала: у чэрвені—130, у ліпені—264, у жніўні—305, у верасьні—377, у кастрычніку—465 і ў лістападзе—253. Павялічыць гэтую колькасьць рабочых было немагчыма, бо па біржы працы не аказалася кваліфікаванай рабочай сілы.

Вызначаная праграма работ на Асінстроі ў сярэднім выканана на 75 проц. Прычыны не выкананьня яе поўнасьцю—дажджлівая пагода, недадача сродкаў, несвачасовае пасьпяленьне іх і інш.

Калі прыняць пад увагу толькі адну недадачу сродкаў, дык атрымаем: сродкаў выдадзена 78 проц., работ выканана—75 проц. Выкананьне зусім здавальняючае. Такі посьпех можна давесьці інтэнсыўнай працай работнікаў Асінстрою, а таксама сьвядомасьцю рабочых, якая выявілася ў цярплівым чаканьні кватэр і добрасумленным выкананьні працы возчыкамі, што дастаўлялі матар'ялы па вельмі дрэнных дарогах.

Трэба адзначыць, што Аршанскі акруговы аддзел кам пальгаса і акруговы аддзел аховы здароўя Асінстрою аддавалі мала ўвагі. Аршанскі камунальна-прамысловы трэст, наадварот, выявіў надзвычайна добрасумленныя адносіны ў дастаўцы Асінстрою лесаматар'ялаў.

Для выкананьня дырэктывы СНА (пусьціць станцыю ў канцы 1929 г.) неабходна правесьці ўсе дапаможныя работы па наладжаньні чыгуначнага транспарту, па заканчэньні часовай электрастанцыі, пабудове і абсталяваньні майстэрняў і па жыльлёвым будаўніцтву ў Арэхах. Апроч гэтага, неабходна вывесьці галоўны будынак да даху, выдаць заказы на галоўнае абсталяваньне як механічнае, так і электрычнае, зрабіць заказы для лініі перадачы, прыступіць да пабудовы паніжаючых падстанцый і шэраг работ на торфараспрацоўках.

Плян гэтых падрыхтоўчых работ быў прадстаўлен у Галоўэлектра і прызнаны там правільным. Гэтыя работы абыйдуцца ў 4144000 рублёў; аднак, Галоўэлектра для пакрыцьця гэтых расходаў вызначыў 2100000 руб. па дзяржаўным бюджэце СССР і 800000 р. па бюджэце БССР, дазволіўшы зрабіць заказы і пасьць на 28-29 год у сумі каля 1000000 р.

Дарэмная трата часу.

Нядаўна закончылася «канфэрэнцыя сацыялістычных партый паўночнага ўсходу Эўропы». Прадстаўнікі розных сацыялістычных партый Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы зьехаліся ў Рызе, каб абгаварыць розныя палітычныя пытаньні сучаснага моманту. Між іншым, у першую чаргу была заслухана справаздача афіцыяльных прадстаўнікоў літоўскай сацыял-дэмакратыі—Кайрыса і Эйнштэйнаса і пасьля этапа прадстаўніка літоўскай сацыялістычнай фракцыі Плечкайціса.

Ад імя НПС адказваў п. Недзялкоўскі.

Абмен афіцыяльнымі асьвядчэньнямі літоўскіх і польскіх сацыялістаў, якія ўзаемоўна маюць больш права лічыць сябе прадстаўнікамі народных мас, паж іх фашыстаўскія ўрады, прадстаўляе і для нас пэўны інтарэс і таму мы спынімся на іх.

Літоўская дэлегацыя заявіла наступнае:

«Адно з найважнейшых страт, якія ... уплыў на заваг рэвалюцыі ... ўнкаў і зьяўляюцца небясьпечнымі ... супакою на паўночным усходзе Эўропы, яна віленская справа. ... ген. Жэліґоўскага на Вільню ... выключна небясьпечную палітычную сітуацыю, якую прыняла было ... становішча вайны між Літвою ... Аноймная пастанова Ліґі ... вынішчала гэта становішча, ... прачрыла аднак віленскае ... што бесспрэчна ... адбыцца ... ціяю ўстаноўкі ... на буйнейшае беларуска-...

урэгуляваных формы вырашэньня;

2) некалькі суседніх дзяржаў адначасова спрачаюцца з-за Віленскай зямлі".

І далей:

„Літоўская і беларуская люднасьць ніколі не далучыцца па добрай волі да сучаснага разьвязваньня віленскай справы. Палітыка экспансіі польскага ўраду і яе налёпізацыйныя мэтады завастраюць гэтыя стасункі і вядуць да „балканізаваньня" ўсходняэўрапейскіх стасункаў. Літоўская дэлегацыя заяўляе далей, што Беларуская Савецкая Рэспубліка высоўвае акрэсьленыя жаданьні на паасобныя часткі Віленскай зямлі. З другога боку грамадзянскі голас Літвы без розьніцы палітычных кірункаў, незалежна ад таго, якое разьвязваньне ў гэтай справе прымае паасобны ўрад Літвы, ні ў якім выпадку ня згодзіцца на вырашэньне справы шляхам перамогі і гвалту".

Зазначыўшы ў далейшым, што літоўскія сацыял-дэмакраты—насупроць нацыяналістычным літоўскім партыям, якія свае жаданьні апіраюць на гістарычных даных,—кіруюцца выключна поглядамі гаспадарчымі, культурнымі і грамадзянскімі, літоўская дэлегацыя ў канцы заявіла:

„Мы моцна перакананы, што адзіным шляхам, пры помачы якога віленская справа можа быць лёгічна і кірна разьвязана, зьяўляецца шлях свабоднага галасаваньня люднасьці Віленскай зямлі. Толькі сам народ можа рабіць пастанову аб сваёй дзяржаўнай прыналежнасьці. Але дзеля гэтага павінны быць свабодныя ўмовы".

Трэба прызнаць, што заява літоўскай дэлегацыі закрапула і досыць усебакова высьветліла віленскае пытаньне. Мы-б ад сябе дадалі толькі адно, што было-б, быць можа, лёгічней гаварыць ... толькі аб Віленшчыне, а і аб іншых ... беларуска-...

гацыі выступіў ад імя партыі польскіх сацыялістаў п. Недзялкоўскі, які сказаў:

„Польская сацыялістычная партыя, азнаёміўшыся з дэклярацыяй літоўскіх эсэраў па віленскім пытаньні, выказвае сваё глыбокае перакананьне, што ў дзень перамогі дэмакратыі ў Польшчы і ў Літве ўсе няжкія спрэчныя справы знойдуць сваё мірнае разьвязваньне на аснове паступіку міжнароднага сацыялізму і права самаакрэсьленьня народаў".

Што можна сказаць аб «дэклярацыі» пэпэсэсаў? Папершае—яна не дае на сутнасьці ніякага адказу на закранутыя літоўскімі эсэраў справы: аб авантуры ген. Жэліґоўскага, аб «вырашэньні» Лігай Нацый віленскага пытаньня, аб палітыцы польскага ўраду ў Віленшчыне, аб беларускіх пратэзіях і г. д. Пэпэсэсы дыпляматычна прамаўчалі пра гэтыя «кавалкі», пакідаючы за сабою поле для «палітыканства», і абмежаваліся абражаючай сэуіцкі-схалястычнай заявай, што пры перамозе «дэмакратыі» у абедзьвюх краінах усё будзе разьвязана як найлепей. П. Недзялкоўскі забыўся пры гэтым высьветліць адну маленькую рэч—якой дэмакратыі? Бо мы ведаем, што і польскія народныя дэмакраты (эндэкі) і хадэкі лічаць сябе дэмакратамі і называюцца імі. У суседняй Польшчы ўсе грамадзяне і ўсе партыі лічаць сябе дэмакратамі. Якой-жа перамогі яшчэ трэба? Яна ўжо ёсьць. Тым болей, што і памаёвы ўрад «саны дэмакратычны» з усіх б. польскіх урадаў.

Нічога не разумеем...

Пасьля ўзаемных асьвядчэньняў пачалася дыскусія, якая ўстанавіла, што кампраміс, устаноўлены ў Жэневе, не азначае выраш...

Такое палажэньне зьяўляецца тым больш небясьпечным, што ў абедзьвюх краінах панує сыстэма ўрадаваньня адзінкі, ці яўная, ці ўкрытая.

Урэшце, канфэрэнцыя пастанавіла высунуць наступныя мінімальныя жаданьні:

«Адкрыцьцё граніц: устаноўленьне нармальных гаспадарчых і палітычных зносін між Польшчай і Літвою, у першую чаргу ўзнаўленьне паштовых, асабістых і таварных зносін на польска-літоўскай мяжы і ўтварэньне праўнага, палітычнага і гаспадарчага правізорыуму для насьленьня, якое жыве ў нейтральнай зоне».

На гэтым больш-менш і скончыліся размовы польскіх і літоўскіх сацыялістаў на канфэрэнцыі. «Роботнік» (№ 352), які зьмясьціў справаздачу аб заявах і дыскусіі па літоўска-польскім пытаньні, у тым-жа нумары надрукаваў і перадавіцу на тэму: «Польска-літоўская спрэчка», аўтарам якой зьяўляецца той-жа п. Недзялкоўскі, які зрабіў на канфэрэнцыі аракуёнадобную заяву.

У перадавіцы п. Недзялкоўскі выкрывае пункты разуменьня пэпэсэсамі віленскай праблемы і спосабы залагоджаньня яе.

„Яшчэ ня многа гадоў таму назад, ніша аўтар, над грамадзянскай апініяй Сярэдняй і Заходняй Эўропы панавала амаль ні агульнае перакананьне, што Віленская Заява „належыць" Літве бяз усякіх перасьцярог, што Польшча паперсту затрабіла ўжыя тэрыторыі насупроць волі іх жыхароў. Тут выявілася малая знаёмасьць стасункаў, гістарычныя ўспаміны, адсутнасьць замежнай прапаганды і г. д".

На канфэрэнцыі п. Недзялкоўскі не казаў, што Эўропа абмылкова лічыла раней Віленшчыну літоўскай і што ... біваюцца больш польскай. Ні ў пачатку арсім працягу яго аўтар ... не ўспамінае аб беларусах і гэта яшчэ раз кладзе на польскіх сацыяліст

ДА 10-ай ГАДАВІНЫ ВСНГ БССР.

2-га студзеня 1918 году пачаў арганізоўвацца Савет Народнае Гаспадаркі Заходняй вобласьці і фронту, які навінен быў заняцца ня толькі пытаньнямі нацыяналізацыі прадпрыёмстваў і іх кіраўніцтвам, але, галоўным чынам, пытаньнямі, зьвязанымі з дастаўкай арміі неабходных рэчаў абмундыраваньня, абозу і інш.

У лютым 1918 г. гор. Менск быў заняты нямцамі, і Савет Народнай Гаспадаркі Заходняй вобласьці і фронту, праіснаваўшы ўсяго каля месяцу, эвакуаваўся ў г. Смаленск.

10-га студзеня 1919 г. Менск зноў занят чырвонымі. У першай палове студзеня 1919 г. у Менску пачынае функцыянаваць Менскі Гарадзкі Савет Народнай Гаспадаркі на чале з т. Гашчынскім, які адначасова быў загадчыкам яго аддзелу матар'яльных і гаспадарчых заготовак. Гэты аддзел, меўшы задачы забесьпячэньня Чырвонай арміі, выконваў адну з важнейшых у той час функцый гарадзкога СНГ.

Поруч з гэтым аддзелам, арганізуюцца: Губпэтал, Гублес, Губхім і іншыя Губаддзелы, а таксама Павятовыя Саветы Народнай Гаспадаркі, якія праводзілі працу па вучоту і нацыяналізацыі прамысловых прадпрыёмстваў.

У пачатку лютага 1919 г., пасьля выданьня дэкрэту аб стварэньні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, Менскі Губсавет Народнай Гаспадаркі рэарганізуецца ў Савет Народнай Гаспадаркі БССР. Старшынёй яго назначаецца тав. Р. Ікель і намесьнікам яго т. Я. П. Падольскі.

У пачатку сакавіка 1919 г. пасьля заняцьця Чырвонай арміяй г. Вільні, арганізуецца ВСНГ Літвы і Беларусі. Старшынёй яго быў тав. В. З. Гінзбург (Тураў) і яго намесьнікамі т. т. Б. Г. Закс і Я. П. Падольскі. У Менску-ж зноў застаецца гарадзкі СНГ на чале з т. Гашчынскім.

У пачатку красавіка 1919 г., у часе 1-га зьезду СНГ Літбел, г. Вільня рантам быў захоплен белапалякамі.

Т. т. Гінзбург, Падольскі і Закс хаваюцца ў падпольле і пазьней прабіраюцца праз Літву ў ССРБ

21-га мая 1919 г. урад Літвы і Беларусі эвакуіраваўся ў Бабруйск. Першым з Вільні туды прабраўся т. Закс, які займае пасаду старшыні ВСНГ Літбел. Пазьней туды-ж прыляджаюць т. т. Гінзбург і Падольскі.

Прадпрыёмствы ў Менску перадаюцца ў веданьне Менгарсавету.

8-га жніўня 1919 г. г. Менск занят белапалякамі, і 14 жніўня ВСНГ Літбел разам з іншымі ўрадавымі ўстановамі эвакуіруюцца з Бабруйска ў г. Смаленск, дзе і праводзіцца ліквідацыя ВСНГ Літвы і Беларусі.

У ліпені 1920 г. пасьля вызваленьня г. Менску ад белапалякаў тав. Вайнэр па загаду ўраду пачынае арганізоўваць СНГ БССР. Потым гэту працу далей праводзяць т. т. А. І. Вайнштэйн і яго намесьнік тав. Цыбарт, але ў кастрычніку 1920 г. СНГ БССР зноў прымушан эвакуіравацца ў гор. Рослаўль.

Гэтым і канчаецца так званы «дагістарычны пэрыяд». Зразумела, што знаходзячыся амаль увесь час у стане эвакуацыі, нала можна было зрабіць. Толькі калі СНГ БССР вярнуўся з Рослаўля, 3 лістапада 1920 г. пачалася і праводзіцца плянавая праца па стварэньню і кіраўніцтву прамысловымі прадпрыёмствамі БССР.

Спачатку ВСНГ Бел. быў арганізаваны па існуючай у той час, так званай, «глаўкаскай» сыстэме. Пры ВСНГ для кіраўніцтва адпаведнымі галінамі прамысловасьці быў арганізаваны цэлы шэраг аддзелаў: Лесбел, Торфбел, аддзел Мэталю і іншыя. Прадпрыёмствы былі падначалены, з аднаго боку, па тэрытарыяльнай адзнацы павятовым саветам народнай гаспадаркі, з другога боку — адпаведным аддзелам ВСНГ БССР.

Гэткае самае падвойнае падначаленьне было з боку ВСНГ БССР і яго аддзелаў прэзыдыуму ВСНГ РСФСР і яго шматлікім галоўным камітэтам.

Але калі ў той час, у пэрыяд так званай старой эканамічнай палітыкі, калі ня было рынку, калі галоўныя камітэты, аддзелы і павятовыя саветы народнай гаспадаркі ведалі толькі дастаўкай прадпрыёмствам сыравіны і разьмеркаваньнем іх прадукцыі па ордэрах—гэту шматлікасьць інстанцый і падвойнасьць падначаленьня можна было цярпець, дык, зразумела, з увядзеньнем НЭП'у існаваўшая структура ВСНГ Бел. патрабавала карэннай рэарганізацыі, якая і была праведзена ў адпаведнасьці з пастановамі 1-га зьезду саветаў народнай гаспадаркі Беларусі (25-28 ліпеня 1921 г.).

У асноўным рэарганізацыя дала наступныя вынікі:

Павятовыя саветы народных гаспадарак, як лішнія бар'еры, былі ліквідаваны, прычым ліквідацыя праводзілася досыць асьцярожна, праз замену іх спачатку павятовымі эканомаддзеламі са значна меншымі правамі і абавязкамі, а потым інстытутам упаўнаважаных прэзыдыуму ВСНГ, існаваньне якіх, прыблізна ў канцы 1922 г. таксама было прызнана непатрэбным.

Частка прадпрыёмстваў была перададзена павятовым выканкомам. Рэшта прадпрыёмстваў былі аб'яднаны ў так званыя групавыя ўправы, а некаторыя пакінуты на правах самастойных гаспадарчых адзінак. Аб'яднаньне праводзілася, як па вытворчых, так і па тэрытарыяльных адзнаках.

Усе ранейшыя губаддзелы былі ліквідаваны. Частка іх функцый была перададзена нанова арганізаваным гаспадарчым адзінкам.

Пры гэтым апарат ВСНГ БССР і яго аддзелаў быў значна скарочаны: з 1009 штатных адзінак у ліпені 1921 г. да 113 чал. у верасьні 1922 г.

На працягу ўсяго наступнага пэрыяду, у адпаведнасьці з пакіраваньнем усёй гаспадарчай палітыкі і значным пашырэньнем правоў і абавязкаў трэстаў і прадпрыёмстваў, структура ВСНГБ паступова спрашчалася і зьмянялася ў бок захаваньня сабе толькі асноўных функцый па рэгуляваньню, кіраваньню і плянаваньню.

Існуючая зараз структура ВСНГ БССР, бязумоўна, зьяўляецца непараўнаўча больш спрошчанай, як была раней.

Разам з тым, ВСНГ БССР, ставячы перад сабой і ўсёй прамысловасьцю задачу правядзеньня пастаноў першага пленуму ВСНГ Саюзу аб далейшай цэнтралізацыі плянавага кіраўніцтва і рэгуляваньня, поўнай дэцэнтралізацыі аперацыйных функцый і адмаўленьня ад дробнай апекі,—навінен будзе імкнуцца да далейшага ўдасканаленьня свайго апарату ў бок спрашчэньня і палепшаньня яго працы.

Мы ўпэўнены, што ў бліжэйшую будучыню мы зможам сьцьвердзіць далейшыя посьпехі ВСНГ БССР у гэтым кірунку.

Пагосцкі.

Праца на мяйсцох.

(Гутаркі з членамі ЦВК БССР).

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ ПРАХОДЗЯЦЬ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. — ВАКОЛ СЫРЦОВАЙ ЗАГАТОЎКІ ТРЭБА ЗГУРТАВАЦЬ ГРАМАДЗКУЮ ДУМКУ. — ПЕРАВЫБАРЫ Ў САВЕТЫ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПРОЙДУЦЬ БОЛЬШ АКТЫЎНА.

СТАРШЫНЯ БЯЛЫНІЦКАГА РВК т. НОВІКАЎ.

— Слабыя хлебазагатоўкі ў нашым раёне тлумачацца, з аднаго боку, слабым ураджаем, а з другога боку—неарганізаванасьцю загатоўцаў. Загатоўчыя цэны на жыта ўстаноўлены ў нас па 1 р. 13 к. за пуд., а прывозны хлеб прадаецца больш як па 1 руб. 60 к. Зусім слушна, што селянін ня хоча прадаваць па гэткай цане і чакае вясны, калі жыта яшчэ падаражэе. Апроч таго, прыватнік плаціць значна даражэй.

Ня лепш абстаіць справа з загатоўкай сёкур, семя і інш. Загатоўчыя цэны на скуры 11 руб., а прыватнік плаціць 15—16 руб.

Шмат нараканьняў выклікае сярод насельніцтва насенная пазыка. Насеньне звычайна выдаюць вельмі позна, калі ўжо пачынаецца сяўба. Часта яно бывае дрэннай якасьці, і насевы ня ўсходзяць. За мінулы год у нашым раёне прапала да 8000 пуд. насеннай пазыкі.

У будучыне пазыку трэба выдаваць шмат раней, належна праверыўшы ўсходнасьць яе.

Мы правялі нядаўна раённыя канфэрэнцыі дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, жаночых дэлегатак і 9 канфэрэнцый беднаты. Гэтыя канфэрэнцыі паказалі, што актыўнасьць насельніцтва значна ўзрасла.

Да адноўных бакоў у нашай працы трэба аднесьці валакіту аб лесапарубках. РВК трэба даць правы здымаць штрафы да 25 руб., а то гэтыя справы разьбіраюцца ў АВК і прэзыдыуме ЦВК. Такая валакіта адымае шмат часу.

Дрэнна яшчэ і тое, што лесазагатоўчыя органы ня выплачваюць акуратна селянам за лесазагатоўку. Затрымка выплаты заробленых грошай зрывае падатковую кампанію.

СТАРШЫНЯ СУРАСКАГА РВК Т. ВАРАБ'ЁЎ.

Пры загатоўках ільнянага валакна сяляне бываюць нездаволены тым, што на загатоўчых пунктах няма зацьверджаных дзяржаўнымі органамі розных сартоў валакна. Каб былі гэтыя маленькія выставачкі ўсіх сартоў таварнага валакна, дык ня было-б нараканьняў на прыёмшчыкаў, што апошнія нібыта паніжаюць нумары сартоў.

Цэны на лекавыя травы вельмі нізкія, а таму сяляне ня хочуць загатоўляць іх.

Загатоўчую кампанію зрывае нездаровая канкурэнцыя, якая існуе паміж с.-г. кааперацыяй і органамі Ўправы Дзяржаўнага Гандлю. У галіне загатоўкі другаразрадных прадметаў трэба зрабіць пералом. У часе перавыбарнай кампаніі ў саветы гэту справу трэба шырока высьвятляць.

Дрэнна яшчэ і тое, што семя, якое загатаўлецца на месцы, адвозяць у Віцебск, а пасьля гэтае-ж самае семя па залуках сялянства нашага раёну вязуць назад з Віцебску, тады як лепш было-б адразу пакідаць семя на месцы.

РВК актыўна рыхтуецца да перавыбараў у саветы. Склікаюцца канфэрэнцыі беднаты, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, жанчын і настаўніцтва. На ўсіх 99 выбарчых вучастках РВК будзе рабіць справаздачы аб працы.

СЕЛЯНІН в. КОДЗІК, ВАЛЫНЕЦКАГА р., ХАТКЕВІЧ ПЯТРО.

(Кандыдат у члены ЦВК.).

— У нашым раёне праводзіцца землеўпарадкаваньне, але ня ўсім шпарка. Трэба павялічыць штат каморнікаў.

На маю думку, па мясцовым бюджэце трэба павялічыць выдаткі на набыцьцё гатунковай скаціны для жывёлаводных т-ваў. Апроч таго, трэба павысіць выдаткі на ўтрыманьне школьных вартаўнікоў.

Абмен зьняволенымі паміж Польшчай і СССР.

Сёньня на прымежнай станцыі Коласава адбудзецца абмен зьняволенымі паміж СССР і Польшчай,—на падставе згоды, якая была падпісана гэтымі днямі прадстаўнікамі Нар. Кам. Замежных Спраў і польскім паслом у Маскве.

Польскі ўрад перадае СССР дзевяць палітычных зьняволеных, якія былі прысуджаны да зьняволеньня на розныя тэрміны. Сярод іх маюцца старыя рэвалюцыянэры—партыйныя працаўнікі.

Замест дзевяці асоб, якія будуць пераведзены на бок СССР, савецкі ўрад выдае Польшчы 33 зьняволеных, якія былі засуджаны савецкім судом за розныя праступленьні да зьняволеньня на розныя тэрміны.

Абмен адбудзецца на станцыі Коласава ў прысутнасьці афіцыйных прадстаўнікоў савецкага ўраду—тав. Казюры і польскага ўраду—Зелязінскага.

Сёньня а 9 й гадзіне зранку на ст. Коласава выяжджае камісія з 7 асоб для сустрэчы прыяжджаючых таварышоў. У камісію ўвайшлі прадстаўнікі ЦК і акругкому Мопр'у, прадстаўнік ЦСПСБ, а таксама і мопраўскіх ячэек. Разам з камісіяй выяжджае прадстаўнік ВК Камінтэрну тав. Плахоцкі.

Прыезд у Менск чакаецца а 5-ай гадзіне ўвечары. У чацьвер адбудзецца агульнагарадзкі мітынг з удзелам прыежджых таварышоў.

* * *

Сёньня ЦК Мопр'у Беларусі і Менскі акруговы камітэт Мопр'у арганізоўваюць спатканьне прыяжджаючым абмененым палітвязьням з польскіх астрогаў.

Просьба да ячэек Мопр'у вылучыць дэлегацыі, якія павінны зьявіцца са сьцягамі а 4-й з паловаю гадз. увечары на вакзал МББ.

Сьвята Беларускай Вайсковай Школы.

Урачысты сход, прысьвечаны 7-мёхгадоваму юбілею школы.

31-га сьнежня ў Доме Культуры адбыўся ўрачысты сход начскладу і курсантаў Аб'яднанай Вайсковай школы імя ЦВК супольна з партыйнымі, савецкімі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі, прысьвечаны 7-мі гадоваму юбілею школы.

Начальнік школы т. **Баласноў** у сваім уступным слове абмаляваў ролю школы ў падрыхтоўцы і выхаваньні чырвоных камандзіраў.

— Наша школа,—кажа прамоўца,—рыхтуе ня толькі вайскоўцаў-спэцыялістаў, але яна выхоўвае і ў сваіх сьценах спэцыялістаў-нацыяналаў, беларусаў, загартаваных узброенай думкай марксізму і ленінізму. 89 проц. курсантаў зараз складаюць беларусы, на 70 проц. усе прадметы выкладаньня пераведзены на беларускую мову, большасьць падручнікаў і статутаў перакладзены на беларускую мову.

Расейскія і беларускія часьці, дзе стажыравалі курсанты, далі вельмі добры водзыў аб працы і вывучцы іх. Гэта сьведчыць аб тым, што школа стаіць на правільным шляху.

Наша задача ў будучыне—яшчэ больш падцягнуцца: зараз Беларуская Вайсковая школа займае другое месца сярод іншых школ Савецкага Саюзу, а трэба пастарацца заняць першае мейсца.

Сэкратар ЦВК БССР т. **Хацкевіч**, выступіўшы з прывітаньнем ад ЦВК, адзначыў, што за год свайго існаваньня школа дала ня толькі добра падрыхтаваных байцоў і абаронцаў краіны саветаў, але таксама выпусьціла з сваіх сьцен сьвядомых савецкіх грамадзян.

— Задача школы, задача кожнага курсанта—сказаў прамоўца,—рыхтаваць сябе да будучай барацьбы з сусьветнай буржуазіяй, якая ня спыняе сваёй падрыхтоўкі да нападу на Савецкі Саюз. Да гэтай рашучай бойкі вы павінны рыхтавацца ня толькі, як вайскоўцы, але і як грамадзяне.

Камандуючы М-й Беларускай дывізіяй тав. **Лакціёнаў** спыніўся на ролі тэхнікі ў сучаснай вайне.

Апрача клясавага разуменьня сваіх задач, будучы камандзір павінен ня ўпасьцю заўладаць усёй тэхнікай вайны, ён павінен навучыцца ўмела прыстасаваць гэту тэхніку да сучасных умоў вайны, калі прыдзецца весьці барацьбу з высока-тэхнічна ўзброеным ворагам.

— Я выказваю надзею, зазначыў т. Лакціёнаў,—што на 8 годзе вучобы Беларуская Вайсковая школа справіцца з сваёй задачай, якую ўскладалі на яе працоўныя савецкай Беларусі і камуністычная партыя. Я ўпэўнен, што курсанты справяцца з тэхнічнай вывучкай, як справіліся і з іншымі задачамі па шляху сваёй вучобы.

Ад імя чыгуначнікаў МББ сход вітаў рабочы т. **Вадзьмак**, які паднёс школе адрас ад рабочых чыгункі.

— Рабочыя,—зазначыў прамоўца,—шчыльна зьвязаны з Беларускай Вайсковай школай, дзе вывучаюць вайсковую справу іх браты і сыны. Калі Савецкаму Саюзу будзе пагражаць небясьпека, усе рабочыя, як адзін, на першым закліку пойдуць разам з вамі бараніць нашу сацыялістычную бацькаўшчыну.

Ад таварыства Осо-Авіяхім сход вітаў т. **Якаўлеў**, які ад імя 25 тысяч членаў т-ва падзякаваў курсантам за добрую вучобу і паднёс ім значкі таварыства.

З адказным словам выступіў тав. **Піньковіч**.

— Мы добра ведаем,—заявіў прамоўца,—што стаімо за праўду. Вось чаму мы перамагалі нашых ворагаў да гэтага часу і пераможам іх і ў будучыне.

Школа ставіць задачу—заняць першае месца да 8-й гадавіны свайго існаваньня, і я ўпэўнен, што мы гэтага дабіёмся.

Сход паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і Рэв. Ваеннаму Савету Беларускага Ваеннага Вокругу.

НА ВАРЦЭ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

ЗЬМЕНА ГАТОВА.

Стройныя, роўныя калёнкамі, з гучнымі песьнямі ідуць дапрызыўнікі Менскага вучпункту к клюбу Карла Маркса.

Весела гараць электрычныя лямпы, іграе духавы аркестр... Сёньня ўрачысты выпуск дапрызыўнікаў (першай палавіны), скончыўшых падрыхтоўку.

Першым выступае начальнік Менскага вучпункту, які каротка спыніўся на выніках вучобы. Ён адзначыў, што не ўпаўне прыстасаванае памяшканьне пункту перашкаджала шырокаму разгортаньню вучобы. Таксама былі і іншыя перашкоды. Потым, начальнік пункту ўказаў і на значныя дасягненьні ў вучобе.

Процант слаба скончыўшых падрыхтоўку вусім невялічкі.

Далей сход заслухвае цэлы шэраг прывітаньняў ад розных арганізацый.

З адказнымі прамовамі выступілі дапрызыўнікі т. т. Збуржынскі Я. і Аляшкевіч, якія ўпэўнілі прадстаўнікоў і камандна-палітычны склад, што дапрызыўнікі па першаму закліку камуністычнай партыі і савецкае ўлады пойдуць усе, як адзін, абараняць краіну саветаў і што дапрызыўнікі з большай напружанасьцю будуць праводзіць васнізацыю на фабрыках, заводах і вёсках.

Прамовы т. т. Збуржынскага і Аляшкевіча накрываюцца гучнымі воплескамі, якія зьявіліся лепшым доказам салідарнасьці ўсіх прысутнічаўшых дапрызыўнікаў з іх прамовамі.

Над туш аркестру раздаюцца лепшым дапрызыўнікам падарункі.

Пасьля ўрачыстасьці было кіно і канцэрт.

Я. Таганскі.

ЗЬМІТРАЎЦЫ ІДУЦЬ ПЕРШЫМІ.

(Вёска Зьмітравічы, Бярэзінскага райёну).

Пасьля доўгай сьнячкі моладзь нашай вёскі ўзялася за працу. Вайсковы гурток ажывіў работу і слбры гуртка практыкуюцца ў стральбе драбінкай. Не адстае і ячэйка ТДА-Авіяхіму. На апошнім сходзе ячэйкі ўхвалена распачаць збор сродкаў на пабудову самалёта імя «Сако і Ванцэці». Ужо сабрана 3 р. 70 к. Падпіска працягваецца.

Што датычыцца чытаемасьці газэты і выпіскі, дык **зьмітраўцы ідуць першымі**, бо на кожныя тры хаты прыходзіцца адна газэта. Газэты выпісваюцца ў большасьці вайсковыя, што значна дапамагае наладжваць васнізацыю насельніцтва.

Што датычыцца другіх вёсак сельсавету, дык яны далёка адсталі ад зьмітраўцаў па ўсіх галінах працы. Моладзь гэтых вёсак, а ў першую чаргу перамеснікі і дапрызыўнікі, павінны ўзяцца за ажыўленьне працы, за стварэньне вайсковых куткоў, гурткоў вайсковых ведаў і ячэек ТДА-Авіяхіму. За працу, моладзь, па прыкладу Зьмітраўцаў.

Б. Ч.

НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ.

У сучасны момант ячэйка ТДА-Авіяхіму заводу «Красная Заря» аб'ядноае 150 чал. У большасьці ячэйка складаецца з рабочых заводу, служачых наецца ўсяго—13 чал. Ячэйка ТДА-Авіяхіму мае розныя гурткі: вайсково-стралковы і санітарны. Вайсково-стралковы гурток аб'ядноае 113 чал., але акуратна наведваюць толькі 70 чал. Заняткі ў гэтым гуртку праводзяцца рэгулярна—1 раз у тыдзень. На занятках вывучаюць як тэарэтычныя, так і практычныя пытаньні. Ня горш працуе і санітарны гурток: у ім налічваецца 15 чал. жанчын, якія акуратна наведваюць яго. Але апроч іх, гурток наведваюць яшчэ многа жанчын рабочых не сяброў гуртка. Актыўную працу вядзе бюро ячэйкі ТДА-Авіяхіму.

Ня дрэнна працуе і рэвізійная камісія, яна дае практычныя ўказаньні ў працы ячэйкі. З боку сяброў ячэйкі ТДА-Авіяхіму прыкмечана яна вялікая зацікаўленасьць да вайсковых газэт: выпісваецца 50 экземпляраў газэты «На страже» і 10 экземпляраў журнала «Красноармеец».

З недахватаў у працы ячэйкі трэба адзначыць наступнае: ячэйка да гэтага часу на мае яшчэ ціра, маецца запазычанасьць сяброўскіх узносаў у суме 7 руб. Зараз вядзецца падрыхтоўчая праца да перавыбараў бюро ячэйкі.

У далейшым перад ячэйкай стаяць наступныя задачы: пабудаваць цір, зьліквідаваць запазычанасьць, паставіць перад завькомам заводу пытаньне аб водпуску 10 руб. штомесячна для патрэб ячэйкі, уцягнуць усіх рабочых у шэрагі ТДА-Авіяхіму.

М. А.

АБ ЧЫМ ТРЭБА ПАДУМАЦЬ, АДЫХОДЗЯЧЫ ДАМОЎ.

Гаварыць аб карысьці цеснай сувязі насельніцтва з Чырвонай арміяй у справе ваенізацыі—ня прыходзіцца. Аб гэтым добра кажуць факты. Гэта задача цалкам ускладаецца на перамесніка, дапрызыўніка, дэмабілізаванага чырвонца і камандзіра.

Мы ведаем, што часта гурткі вайсковых ведаў адчуваюць недахват неабходных вайсковых прыладаў. Мы маем і такія выпадкі, калі гурток вайсковых ведаў ня ведае, з чаго пачынаць, каб разгарнуць працу па ваенізацыі насельніцтва.

Першыя правядзеньня дапрызыўнікоў вельмі спрыяе таму, каб гэтыя недахопы зьнішчыць. Тут і жывая сувязь з арміяй, тут і магчымасьць атрымаць тыя ці іншыя вайсковыя прылады, вайсковую літаратуру і інш.

Каб гэтага дасягнуць, кожны дапрызыўнік, ідучы дамоў, навінен прыдумацца над тым, як ён будзе дома праводзіць працу па ваенізацыі насельніцтва і папаўняць свае веды.

У мінулым годзе відомы такія факты, калі рабочая моладзь з фабрыкі пісала ў полк камандзіру палка і прасіла дапамогі ў наладжваньні працы гуртка вайсковых ведаў. Прасілі ня толькі парады, але і матар'яльнай дапамогі. Між тым гэтыя пытаньні дапрызыўнікам трэба вырашаць у час сваёй вучобы на пункце.

Вайскор.

СЬВЯДОМАЯ ДЫСЦЫПЛІНА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОСЬПЕХІ ВУЧОБЫ.

(Гор. Віцебск, Ялагоўскі дапрызпункт).

Глухі Ялагоўскі райён гораду цяпер ажыў. З самай раніцы і да 6 гадзін вечару галоўная вуліца гэтага райёну заўсёды запоўнена дапрызыўнікамі, якія сурэзна ўзяліся за дапрызыўную падрыхтоўку. Кожны дзень не прападае даром.

Нават вольныя хвіліны дапрызыўнік імкнецца скарыстаць як найлепш: працуе ў гурткох, піша ў насьценную газэту, чытае газэты ў ленкутку і інш.

Пры дапрызыўным пункце арганізавана шмат гурткоў: драматычны, караспандэнцкі, вайсковы і інш. Але заняткі да гэтага часу праходзілі слаба, ёсьць шмат дапрызыўнікаў, якія ня ведаюць, у які гурток ім уступіць. Дапрызыўнікі пастанавілі таксама мець і сваю насьценную газэту, для чаго абралі рэдкалегію, якой даручана кіраваць гэтай працай.

Пры пункце маецца і ленкуток, але апошні ня поўнасьцю задавальняе запатрабаваньні дапрызыўнікаў. Цеснае палепшаньне, адсутнасьць належнай літаратуры і газэт—гэтаму прычыны.

З вялікай увагай дапрызыўнікі ў вызначаны час стала вывучаюць вінтоўку. Усюды прыкмячаецца дысцыпліна. Кожны добра ведае сваё месца і ў казарме і на вайсковых занятках.

П.

ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ ДАПРЫЗЫЎНІКА.

(Рагачоўскі р., Бабруйскай акругі).

350 маладых грамадзян 1906 году нараджэньня каля месяца праходзяць дапрызыўную вучобу, пад кіраўніцтвам 18 інструктароў.

Не старая казарменная палачная муштроўка, а плянавае сьвядомае вывучэньне вайсковай справы на працягу 180 вучэбных гадзін дасягаецца паступным раскладам працоўнага дня: 8-9 гадзін—палітзаняткі; 9-12 гадз.—страляніна; 2-5 гадз. — тактычныя, страявыя заняткі: 7-8 г.—агульнаадукацыйныя гурткі.

У час адпачынку дапрызыўнік ідзе ў кіно, у розныя клюбы, падрыхтоўвае насьценгазэту і г. д. У насьценгазэце дапрызыўнікі выказваюць пажаданьне аб пашыраньні агульнага памяшканьня, аб абмундыроўцы для незаможных.

У мірны час—рыхтуйся да вайны, а ў выпадку вайны—змагайся за мір паміж працоўнымі! З такім настроем малады дапрызыўнік кожны год рыхтуецца да абароны савецкай краіны.

М. Віч.

Ваенізацыя прахо-дзіць пасьпяхова.

(Менскі ЦРК).

Уся праца па ваенізацыі служачых Менскага ЦРК праводзіцца ў вайсковым кутку. Пагыбленьне гэтай працы асабліва прыкметна з „тыдню абароны", у правядзеньні якога служачыя прынялі шчыры ўдзел і сабралі 655 рублёў.

Пры вайсковым кутку маецца гурток вайсковых ведаў—40 чал., санітарны гурток—17 чал.; пры чым нядаўна адбыўся выпуск адзнака санітарнага гуртка. Шырока разгарнула сваю працу ячэйка Авіяхіму, у якой налічваецца 160 чал.

Заняткі вайсковых гурткоў праводзяцца па праграме Авіяхіму СССР. Ужо тэарэтычна скончана вывучэньне стралковай справы і праведзена 2 стральбы з вінтоўкі. Нядаўна быў праведзен конкурс на лепшага стралка з вінтоўкі, дзе прымала ўдзел 80 чал., першы прыз па стральбе атрымала мантчына-камсамолка.

На далёкім часе працы намячаецца правядзеньне гутарак аб кавалерыі, артылерыі і тапаграфіі з адначасовым правядзеньнем экскурсіі ў вайсковыя часьці.

Камслуж дапамагае ў працы па ваенізацыі і кожны месяц адпускае на яе 20 р.

Таксама нельга не адзначыць добрую дапамогу з боку партыйнай ячэйкі, у прыватнасьці—сэкратара.

Я. Таганскі.

Студэнты-тапографы.

(Магілеўшчына).

Пасьля доўгага чаканьня, вайсковая справа (вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка) уключана ў вучэбную праграму Магілеўскага зямельнага тэхнікуму.

Студэнты ахвотна ўзяліся за вайсковую вучобу. Мы ўжо малюем карты, вывучаем разам з гэтым вайскова-хімічную справу. Адно кепска, што лекцыі па вайсковай справе заўсёды апошнія, калі студэнты ўжо стомленыя.

Апрача гэтага, у нашай бібліятэцы не хапае вайсковых кніг для падрыхтоўкі.

Н. К.

ВЕСТКІ ТДА-АВІЯХІМУ.

КААПЭРАЦЫЙНЫЯ ОРГАНЫ—ЧЛЕНЫ ТДА-АВІЯХІМУ.

Улічваючы вялікае значэньне ДТА-Авіяхіму ў справе абароны краіны саветаў, усе каапэрацыйныя органы БССР: Белкаапсаюз, Белсельсаюз, Белжылсаюз, беларускі саюз інваліднай каапэрацыі, ЦКСУ і г. д. уступілі ў члены ТДА-Авіяхіму, як юрыдычныя асобы. Апошнія ўжо ўнесьлі сяброўскія і ўступныя ўзносы.

НОВАЯ ІНСТРУКЦЫЯ АБ УЗЫСКАНЬНІ СЯБРОЎСКІХ УЗНОСАЎ.

Цэнтральны савет ТДА-Авіяхіму распрацаваў новую інструкцыю аб парадку ўзысканьня сяброўскіх узносаў. Згодна гэтай інструкцыі, сяброўскія ўзносы павінны выплачвацца праз кожныя 3 месяцы.

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

30 сьнежня пад старшынствам тав. А. Чарвякова адбылося пасяджэньне прэзыдыуму ЦВК.

Разгледжан шэраг пытаньняў:

АБ СКЛІКАНЬНІ ЗЬЕЗДАЎ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

У мэтах падагульваньня праведзенай культурнай і эканамічнай работы сярод нацменшасьцяў, а таксама вызначэньня перспрыёмстваў на далейшы час, прэзыдыум ЦВК пастанавіў склікаць на 8 студзеня 1928 г. усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў і на 20 студзеня 1928 г.—зьезд сялян-яўрэяў.

Намянёныя зьезды нацменшасьцяў праводзяцца ад імя нацкамісіі ЦВК і пад яе непасрэдным кіраўніцтвам.

СЫСТЭМА НАРОДНАЙ АСЬВЕТЫ.

Заслухан даклад Наркамасьветы тав. Баліцкага аб сыстэме народнай асьветы.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў пытаньне аб сыстэме народнай асьветы паставіць на сэсіі ЦВК у парадку пэрспэктыўнага абгаварэньня з тым, каб пасьля сэсіі адпаведныя матар'ялы былі разасланы на месцы для абгаварэньня, пасьля чаго пытаньне будзе зноў унесена на разгляд бліжэйшай сэсіі альбо чарговага зьезду саветаў. Дакладчыкам гэтага пытаньня вызначан тав. Баліцкі.

АБ АДКЛІКАНЬНІ ВЫБАРШЧЫКАМІ З САВЕТАЎ ВЫБРАНЫХ ІМІ ДЭПУТАТАЎ.

Прэзыдыум ЦВК прыняў пастанову аб адкліканьні выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі дэпутатаў. Згодна гэтай пастановы выбаршчыкі могуць адклікаць з саветаў выбраных імі дэпутатаў і пры наяўнасьці адной з наступных прычын: а) невыпаўненьне наказу выбаршчыкаў; б) адмова ад выпаўненьня даручэньняў савету; в) сыстэматычнае непаведваньне пасяджэньняў савету; г) недапушчальнае для члена савету правядзеньне.

Пытаньне аб адкліканьні з савету дэпутатаў можа быць узьнята: выбаршчыкамі ня менш трэці выбаршчыкаў данага выбарчага вучастку; прафэсыянальнымі арганізацыямі; камітэтамі ўзаемадапамогі і інш. грамадзкімі арганізацыямі; дэлегацкімі сходамі жанчын, а таксама і самымі саветамі. Заявы аб адкліканьні дэпутата падаюцца ў адпаведны савет, які, абгаварыўшы пытаньне аб адкліканьні дэпутата, выносіць рашэньне аб скліканьні сходу выбаршчыкаў.

АБ ПАШЫРЭНЬНІ НА ТЭРЫТОРЫЮ БЫЎШЫХ ГОМЕЛЬСКАГА І РЭЧЫЦКАГА ПАВЕТАЎ КОДЭКСАЎ БССР.

Зацьверджан унесены СНК БССР праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР пра пашырэньне на тэрыторыю былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў грамадзянскага, грамадзянска-працэсуальнага, крымінальна-працэсуальнага і лясного кодэксаў і вэтэрынарнага статуту БССР. Паказаныя кодэксы і статут пашыраюцца на тэрыторыю былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў з 1 студзеня 1928 году замест дзейнічаючых там кодэксаў і вэтэрынарнага статуту РСФСР.

ПРА ПАЎНАМОЦТВЫ НАРОДНЫХ ЗАСЯДАЦЕЛЯЎ.

Зацьверджан унесены СНК БССР праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР пра працяг да 1-га студзеня 1929 г. паўнамоцтваў народных засядацеляў, выбраных у 1927 г.

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГІ.

Зацьверджан унесены СНК БССР праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР аб рэарганізацыі сельскіх саветаў Гомельскай акругі. Згодна паказанай пастановы, існуючыя па Гомельскай акрузе 463 сельскія саветы рэарганізуюцца ў 217 саветаў, у тым ліку нацсаветаў: расейскіх—14, польскіх, украінскіх — 2, яўрэйскіх—2. Гомельскаму акрвыканкому даручана правесьці падрыхтоўчую працу на рэарганізацыі сельскіх і местачковых саветаў, адначасова з правядзеньнем падрыхтоўкі саветаў да перавыбараў.

АБ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ.

Зацьверджан прэзыдыум Цэнтральнай Выбарчай Камісіі ў наступным складзе: т. т. Хацкевіча (старшыня камісіі), Рыжоў (нам. старшыні камісіі), Файнбург, Каплан і Крэмэр.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ НАЦПАЛІТЫКІ ПА АКРУГАХ.

Прэзыдыум ЦВК згадзіўся з прапановай Нацкамісіі ЦВК аб заслуханьні на пасяджэньнях прэзыдыуму ЦВК дакладаў Віцебскага і Бабруйскага акрвыканкомаў па пытаньнях правядзеньня нацпалітыкі ў гэтых акругах. Нацкамісіі ЦВК даручана зрабіць праверку на месцах выкананьня дырэктыў ураду аб нацпалітыцы, з тым, каб потым разам з дакладамі адпаведных акрвыканкомаў заслухаць і даклады Нацкамісіі ЦВК.

Рабочае жыцьцё.

ПРЫМУШАЮЦЬ ІСЬЦІ ДА ПРЫВАТНІКА.

(М-ка Круглае).

Забытае, глухое м-ка Круглае. Месяцамі ня ўбачыш новай асобы, кожны сядзіць у сваім кутку, як сурок. І кепская робіцца тут справы. У той час, калі на абшарах СССР у самых далёкіх вёсках прымаюцца самыя рашучыя меры к барацьбе з прыватнымі гандлярамі, у нас у Круглым робіцца іншае: сілком застаўляюць ісьці к прыватнаму крамніку. У м. Круглым даўно існуе каапэрацыйная крама, на сваіх плячох вынесьлі яе мясцовыя служачыя ў самыя цяжкія гады, укладываючы туды грошы. І да сьнежня м-ца так-сяк пайшчыкі былі задаволены. Але тут і начынаецца ня то злачынства, ня то глупства. Праўленьне спажыв. каапэрацыі раптам зачыніла кредыт усім пайшчыкам-служачым. Гэта было як пярун сярод яснага неба. Чаму? як?—пасыпаліся пытаньні. А старшыня праўленьня і ў вус ня дзьме. Нам зачынілі кредыт і мы не даём.

Таварыш, родны, так робіць толькі безгаловы. Служачых больш 100 асоб, кожны ў месяц у сярэднім набіраў рублёў на 15. Усе гэтыя грошы пойдуць прыватніку... А прыватнік толькі таго і чакаў. «Калі ласка, хадзеце, хоць на 100 руб., і скідку дадзім». І радасна пацірае рукі, бо занадта з аволены глупствам гора-каапэратараў. РВК таксама адмаўляецца дапамагчы ў гэтай справе, бо задаўся мэтай увесьці служачых у «цьвёрды» бюджэт. Ці ня зьверне хто ўвагі на такую справу і ці ня дасьць па шапцы кіраўнікам каапэрацыі за такое «каапэраваньне» насельніцтва, бо ў мястэчку ўжо адчынілася яшчэ новая прыватная крама, а пры такім вядзеньні спраў яны вырастуць як грыбы. Хутчэй трэба накіраваць да нас і добра пазнаёміцца з нашым каапэратывам, працы для рэвізора знойдзецца.

Служачы.

Рабочыя акраіны бяз сьвету.

(Слуцак).

Многа ў нас гаварылася, а нават і пісалася аб электрычным асьвятленьні акраін. Гэта зічылася адным з галоўных дасягненьняў працы гарсавету.

Летась і сапраўды было добра: некалькі ліхтароў асьвятляла вуліцы прыгараду Остраў. Бяда была ў тым, што мясцовыя хуліганы часамі псавалі ліхтары. Тады цэлыя тыдні ня было сьвету. Насяленьне лаяла сваіх хуліганаў на «чым сьвет стаіць». Так цягнулася каля году. Праўда, сьвет быў такі, што асьвятляў толькі на матраў 200 навакол, але і то было добра. Насяленьне было рада і гэтаму сьвету, бо ліхтары настаўлены ў самых гразкіх мясцох.

Цяпер-жа і гэтага няма. З восені яшчэ нейкі час гарэлі ліхтары, а потым нешта здарылася такое, што ўсе яны, апрача аднаго, патухлі.

Трэба гарсавету зьвярнуць увагу на гэтае зьявішча і сапраўды даць сьвет акраінам.

П. А.

Няма шэфпрацы.

(Ст. Асіпавічы, Зах. чыг.).

Гады два таму назад наш мясцком чыгуначнікаў сумесна з клюбам трымаў культурнае шэфства над адстаючай вёскай як у вярсьце вёскай. Там на сродкі мясцкому ўтрымоўвалася хата-чытальня.

Але вось зьмяніўся парадак шэфства, пачалі арганізоўвацца шэфскія таварыствы, якія і павінны былі цяпер праводзіць культпрацу на вёсцы. Наш мясцком худзенька адмовіўся ад шэфства, але склясьці шэфскае таварыства не пакланаціліся.

Так і засталася вёска Асіпавічы бяз шэфаў. І гэта ў той час, калі пад бокам у яе знаходзіцца моцны саюз чыгуначнікаў, які шмат можа зрабіць на вёсцы.

Трэба чыгуначным ячэйкам КПБ у сурёз падумаць аб стварэньні шэфскага таварыства, не запамятываючы ўсёй карыснасьці і адказнасьці гэтае працы.

Хв. Шынклер.

Праца юнсэкцый пры клюбах.

(Гор. Віцебск).

З развіцьцём культурных запросаў моладзі, юнсэкцыі пачынаюць набываць усё большае і большае значэньне. Юнсэкцыі па горату пачалі арганізоўвацца яшчэ 2 гады таму назад і цяпер па ўсіх гарадзкіх клюбах яны разгарнулі сваю працу. Трэба адзначыць, што да 1927 году яны працавалі кепска і толькі ў гэтым годзе [illegible] некаторае [illegible] працы. В распоряджэньні працы неабходна зазначыць: калектыўнае наведваньне кіно і тэатраў, розныя экскурсіі, арганізацыя гурткоў і інш. З адмоўных бакоў у працы апошніх трэба адзначыць: слабы ўдзел у беларусізацыі, некаторае адсутнічаньне кіраўнікоў гурткоў і г. д.

У далейшым неабходна зрабіць так, каб кожная юнсэкцыя зьяўлялася часткай працы кожнага клюбу і каб апошнім давалі асобныя памяшканьні і спэцыяльныя дні. Акрпрафсавет акружкамолу зьвярнуў увагу на працу юнсэкцый і ў бліжэйшыя дні будзе праведзен конкурс на лепшую і горшую юнсэкцыю. Матар'ялы аб працы гарадзкіх юнсэкцый ужо пачалі паступаць у акруговую газету «Заря Запада».

П.

Танцы да ўпаду.

Ставя сьмех, так яно і было ў рабочым клюбе г. П.-Барысаве. Саюз карчавікоў 24-12 1927 г. зрабіў вечар. Перш наеліся, напіліся, накурылі, што аж цёмна стала і давай танцаваць. Танцавалі нават старыя. Іншыя з рабочых танцуючы паваліліся. Варта ў дзьвярох «працавала», выпіраючы п'яных.

Час ночы, электрычны сьвет патух. Купілі сьвечкі запалілі і лёгкія на пагах, падмацаваныя «горкай» рабочыя шпарылі ва ўсю.

Вось ён, сямейны культурны вечар да 3-х гадзін ночы, які будзе запісан завкомам у справаздачы «культпраца».

Сьведка.

Хроніка.

Да скліканьня сэсіі ЦВК БССР.

У Менск пачалі ўжо зьяжджацца члены ЦВК на надыходзячую Сэсію.

Сёньня а 6-й гадзіне ўвечары распачынаецца пленум Бюджэтнай Камісіі ЦВК.

У часе перарыву сэсіі для членаў ЦВК будуць арганізаваны экскурсіі на фабрыкі, заводы і ў культурныя інстытуцыі.

Для ўдзельнікаў сэсіі ў Дзяржаўным тэатры будуць пастаўлены п'есы—„Каля тэрасы" і „Цар Максімільян".

313.088 бядняцкіх гаспадарак атрымалі льготы па с.-г. падатку.

Згодна закону аб сельска-гаспадарчым падатку, у 1927-28 годзе па БССР вызвалена ад падатку поўнасьцю: па неабкладным мінімуму даходу—61.022 бядняцкія гаспадарні, ці 7,7 проц. агульнай колькасьці гаспадарак, і па льготных фондах (у тым ліку і па маніфэсту ЦВК СССР)—131.718 бядняцкіх гаспадарак, ці 16,5 проц. агульнай колькасьці гаспадарак.

Усяго вызвалена поўнасьцю бядняцкіх гаспадарак 192.740, ці 24,2 проц. агульнай колькасьці гаспадарак у БССР. З гэтай колькасьці гаспадарак зьнята падатку: па неабкладным мінімуму—105.340 руб. і па льготных фондах—705.594 руб., а ўсяго зьнята падатку 810.934 руб., ці 7,5 проц. агульнай сумы налічанага падатку па БССР.

Акрамя гэтага па БССР часткова атрымалі льготы за кошт льготных фондаў (у тым ліку і па маніфэсту ЦВК СССР) 120.348 маламоцных гаспадарак, 15,1 проц. агульнай колькасьці гаспадарак на суму—582.274 руб., ці 44,4 проц. налічанага на іх сельска-гаспадарчага падатку.

Такім чынам, усяго па БССР вызвалена поўнасьцю і часткова 313.088 бядняцкіх і маламоцных гаспадарак, ці 39,3 проц. агульнай колькасьці, гаспадарак на суму 1.393.208 руб.

Па асобных округах БССР льготы атрымалі: па Бабруйскай акрузе—33,8 проц. агульнай колькасьці гаспадарак акругі, Віцебскай—41.8 проц., Гомельскай—41,7 проц., Менскай—37.4 проц., Магілеўскай—36,9 проц., Мазырскай—44.4 проц., Аршанскай—38,5 проц. і Полацкай—47,7 проц. агульнай колькасьці гаспадарак.

На змаганьне з бясспрытульнасьцю.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР ужо распрацавала пляны працы па барацьбе з дзіцячай бясспрытульнасьцю на 1927-28 апэрацыйны год. Згодна гэтага пляну, па каштарысу 1927-28 году на гэту патрэбу прадугледжваецца 275.896 руб. 61 к. Гэтыя сродкі пойдуць на паляпшаньне быту і становішча бясспрытульных дзяцей у БССР. Па гэтыя сродкі будзе забясьпечана 720 дзяцей поўнасьцю і часткова—812 дзяцей. Найбольш сродкаў будзе патрачана на заканчэньне і ўтрыманьне ўсебеларускай дзіцячай камуны ў г. Магілеве. У 1927-28 гаспадарчым годзе на ўтрыманьне апошняй адпускаецца 113.912 руб.

Апроч гэтага, у 1927-28 годзе будуць арганізаваны ў горадзе Воршы майстарні для бясспрытульных дзяцей, на што прадугледжваецца—7.000 руб.

У Віцебскай акрузе для дзяцей камуны імя Крупскай будзе пабудаваны будынак, на што прызначаецца 15.000 руб.

На паляпшаньне становішча дзіцячых дамоў Цэнтральная Дзіцячая Камісія на 1927-28г. асігнавала 22.500 р. Вялікая праца на барацьбе з дзіцячай бясспрытульнасьцю будзе таксама праведзена і па лініі НК Аховы Здароўя БССР, на сродкі апошняга будзе ўтрымлівацца 15 ясельных коек у Магілеве, 10—у Барысаве, 10—у Гомелі, і 75 ясельных коек у Менску. На летнюю ясельную кампанію і на арганізацыю дзіцячых плошчак па лініі НК Аховы Здароўя будзе адпушчана 2000 руб. Усяго на лініі НК Аховы Здароўя БССР на паляпшаньне становішча і быту бясспрытульных дзяцей у 1927-28 апэрацыйным годзе будзе адпушчана 42.725 руб.

Што датычыцца патраніраваньня (аддача дзяцей на выхаваньне), то па лініі НК Асьветы ў 1927-28 годзе будзе перададзена на выхаваньне ў сялянскія сям'і 50 дзяцей, саматужнікам і рамесьнікам—70 дзяцей і ў гарадзкія сям'і—50 дзяцей. Усяго на патраніраваньне будзе патрачана 14.900 р., што датычыцца прыбыткаў Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР, то ў 1927-28 годзе, згодна пляну, мяркуецца атрымаць на барацьбу з бясспрытульнасьцю 200.000 руб.

Праэкт сыстэмы Народнай Асьветы ў БССР.

Прэзыдыум Дзяржпляну разгледзіў праэкт НК Асьветы аб сыстэме народнае асьветы ў БССР. Гэты праэкт прыняты за аснову пры далейшай распрэдоўцы сыстэмы народнае асьветы. Паміж іншым, прэзыдыум Дзяржпляну вазначыў, што для наданьня сыстэме народнае асьветы адпаведнай цэласнасьці і гібкасьці НК Асьветы ў далейшым павінен прадугледжваць як мага большае паяднаньне прафтэхнічай асьветы.

Усебеларускі зьезд палянаў адбудзецца ўвосень.

Усебеларускі зьезд працоўных-палякаў, які меў адбыцца ў сакавіку, з прычыны перавыбарчай кампаніі ў саветы, згодна пастановы нацкамісіі, адбудзецца ўвосень г.г.

Міждапамога цяжарным.

За апошнія 9 месяцаў 1927 году ў 3-х менскіх кансультацыях для цяжарных зарэгістравана 13291 наведваньне. Цяжарныя жанчыны ў кансультацыях галоўным чынам атрымлівалі парады ўрачоў.

Пашырэньне сеткі хлебных крам.

Дзеля паляпшэньня абслугоўваньня насельніцтва печаным хлебам, Наркамгандаль БССР даручыў Белкаапсаюзу і Белрабсэкцыі пашырыць сетку пунктаў па продажу печанага хлебу ў округах БССР.

Запрашэньне на кангрэс Інтэрнацыяналу вольнадумаў.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту атрымала запрашэньне на кангрэс інтэрнацыяналу прамігарскіх вольнадумаў. Апошні адбудзецца ў г. Кёльне (Нямеччына) 4-га студзеня.

Выпуск дапрызыўнікаў.

Заняткі на дапрызыўных пунктах ужо скончыліся. У пятніцу, 30-XII, у Менску адбыліся вечары, прысьвечаныя скончэньню заняткаў. Лепшым дапрызыўнікам выдаваны спэцыяльныя значкі ў адзнаку добрых посьпехаў у часе заняткаў.

Горача вітаці дапрызыўнікі на вечарох сваіх камандзіраў.

Сельская гаспадарка.

Статут Наркамзему.

Наркамзем БССР зараз распрацоўвае праэкт статуту, на грунце якога прадугледжваецца вранце ўсіх паасобных яго органаў. Праэкт статуту перададзена ў хуткім часе на зацьверджаньне ўрازу.

Нарада зямельных працаўнікоў.

На 15-га студзеня ў Менску скліканца ўсебеларуская нарада акруговых зямельных працаўнікоў. На нарадзе будуць абмяркоўвацца пытаньні землеўпарадкаваньня на гэты год, арганізацыі ўсебеларускай с.-г. выстаўкі і інш.

У Прэзыдыуме Цэнтральнай Дзярж. Камісіі пры ЦВК БССР.

21.308 руб. на ўтрыманьне клюбу-сталоўкі для бясспрытульных.

Згодна пастановы Прэзыдыуму Цэнтральней Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР, у 1927-28 апэрацыйным годзе на ўтрыманьне клюбу-сталоўкі для бясспрытульных дзяцей будзе адпушчана 21.308 руб.

Сродкі на выпуск перароскаў з дзіцячых дамоў.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР пастанавіў адпусьціць Аршанскай акрузе на выпуск перароскаў з дзіцячых дамоў 1000 руб.

Дадатковае асыгнаваньне на заканчэньне пабудовы Ўсебеларускай Дзіцячай Камуны.

На ўнутранае заканчэньне пабудовы Ўсебеларускай Дзіцячай Камуны ў 1927-28 апэрацыйным годзе будзе дадаткова адпушчана 19.435 руб. З гэтай сумы на заканчэньне майстэрняў і сталоўкі прызначана 3.839 р.

Арганізацыя „Галоўнавукі".

Пры Наркамасьвеце арганізавана Галоўная Управа па справах навукова-дасьледчых устаноў, інакш нажучы „Галоўнавукі".

Веданьню Галоўнавукі падлягаюць: навукова-дасьледчыя інстытуты і катэдры; Дзяржаўная бібліятэка і яе аддзяленьні; музэі; ахова помнікаў прыроды, старасьветчыны, быту і мастацтва: запаведнікі, сады, паркі; экспэдыцыі, якія маюць важнае дзяржаўнае значэньне; падрыхтоўка навуковых працаўнікоў; навуковыя таварыствы. праазнаўчыя арганізацыі і інш.

На пасаду старшыні „Галоўнавукі" Наркамасьветы назначаны з 1 студзеня 1928 г. Некрашэвіча Сьцапана.

Дапамога барацьбітам рэвалюцыі.

Зімовая кампанія дапамогі палітзьняволеным Заходняй Беларусі і Польшчы ўсё больш разгортваецца, асабліва ў Менску. Так, чыгуначнікі Заходніх чыгунак на агульным сходзе пастанавілі адлічыць 1/2 прац. месячнага заработку ў карысьць палітзьняволеных; ячэйка Мопр'у Наркамюсту сабрала 100 руб., стралковы полк сабраў па падпісных лістох—70 руб., аб'яднаная прафтэхшкола—30 руб. і г. д.

Ускалыхнулася і вёска. Так, Сьмілавіцкі райком Мопр'у ўжо сабраў 60 руб. Збор сродкаў у карысьць палітзьняволеных адбываецца і ў іншых раёнах Менскай акругі. Апроч матар'яльнай дапамогі, праводзіцца і агітацыйная праца на высьвятленьні сучаснага становішча ў Заходняй Беларусі, Польшчы і Кітаі. У 26 ячэйках Мопр'у палітэміграватамі і актыўнымі сябрамі Мопр'у праведзены адпаведныя даклады.

Падрыхтоўка да вясеньняй пасяўной кампаніі.

Белсельсаюз у часе вясеньняй пасяўной кампаніі мяркуе разьвіваць праз сельска-гаспадарчую каапэрацыю: рознага насеньня—на 1.269.000 руб., штучнага ўгнаеньня—на 250.000 руб. і сельска-гаспадарчых машын на суму да 600 тысяч рублёў.

Азнаямленьне з ходам хлебазагатовак.

Намесьнік НК Гандлю тав. Брыскін, кіраўнікі хлебазагатоўчых устаноў і шэраг іншых адказных працаўнікоў НК Гандлю ўчора выехалі ў акругі і райёны для азнаямленьня з ходам хлебазагатовак у БССР. Будзе зьвернута моцная ўвага на зьнішчэньне недахватаў, якія маюць месца ў справе хлебазагатовак у округах.

Да пабудоўкі 3 новых хлебазаводаў.

Нар. Кам. Гандлю СССР намеціў пабудаваць, апроч існуючага хлебазаводу ў Менску, яшчэ 3 новыя хлебазаводы: у Віцебску, Гомелі і Магілеве. Уплыта пытаньне аб фінансаваньні пабудовы хлебазаводаў у Віцебску і Гомелі за кошт саюзных сродкаў.

Адчыненьне 6-й канфэрэнцыі ЛКСМБ Гаррайёну.

Пяць удараў у звон. На гарадзкой вежы... 5 гадзін...

Групкамі і паасобку ідуць дэлегаты-камсамольцы Менскай Гарадзкой арганізацыі на сваю 6-ю райённую канфэрэнцыю.

Ля дзьвярэй клюбу Гарсавету таўкучка. Шмат гасьцей-камсамольцаў, якія жадаюць пашасьць на адчыненьне канфэрэнцыі.

Канфэрэнцыю гарадзкай райённай арганізацыі можна лічыць заключным акордам у шэрагу райённых камсамольскіх канфэрэнцый, якія адбыліся на ўсіх райёнах БССР. У Гомелі нават ужо адбылася і акруговая канфэрэнцыя ЛКСМБ.

Канфэрэнцыя гарадзкога райёну адбываецца напярэдадні Менскай акруговай канфэрэнцыі, якая скліканца 14 студзеня, і Ўсебеларускага зьезду ЛКСМБ, які адбудзецца ў пачатку сакавіка. Перад гарадзкой арганізацыяй стаяць найскладанейшыя задачы, над вырашэньнем якіх будзе яна працаваць.

На 5-й канфэрэнцыі дакладчыкам па першым пытаньні аб рацыяналізацыі вытворчасьці выступіў тав. Чарнякоў, ён-жа зрабіў даклад і на 6-й канфэрэнцыі.

6-я райённая гарадзкая канфэрэнцыя ЛКСМБ заняўніла партыю сваёй дзеяльнасьці прынятай рэзалюцыяй у тым, што райённая арганізацыя падрабязна вывучыць пастановы XV зьезду і энэргічна будзе дапамагаць партыі ў ажыцьцяўленьні гэтых пастаноў.

Кастрычнікавы набор даў Менскай гарадзкой камсамольскай арганізацыі 150 новых сяброў—маладых рабочых ад станку.

Аб глыбокай сувязі камсамольскіх ячэек з рабочай моладзьдзю таксама яскрава сьведчылі шматлікавыя прывітаньні, якія адбыліся на адчыненьні канфэрэнцыі.

Р. Г.

Дзяржаўнае страхаваньне.

Страхаваньне жыцьця.

За апошнія 2 месяцы 1927 г. паступіла 22.235 руб. па страхаваньні жыцьця. Выдачы ўзнагарод па гэтым страхаваньні ня было за адсутнасьцю выпадкаў сьмерці застрахаваных.

Страхаваньне ад няшчасных выпадкаў.

З 1-га кастрычніка да 1 сьнежня 1927 г. паступіла 1655 руб. па страхаваньні ад няшчасных выпадкаў, а выплачана за гэта час узнагарод па гэтым страхаваньні 1055 руб.

Страхоўка па Менскай акр. паступае слаба.

Страхоўка па Менскай акрузе паступае слаба. Усяго да 15 сьнежня паступіла 20 проц. гадавога зданьня, а павінна было паступіць 40 проц.

123.772 руб. выплачана страхоўні па пажарах.

З 1-га кастрыч. да 1-га сьнежня 1927 г. выплачана страхоўні па пажарах 123.772 руб. За гэты час [illegible] 13 пажараў.

59.560 руб. ільготнае па Менскай акрузе.

Менскі акрстрах прадаставіў бедным 59.560 руб. ільгот на аплаціным страхаваньні. Акрстрах прыняў захады да хуткага разьмеркаваньня ільгот сярод бедных.

Колькі прапала жывёлы.

За кастрычнік і лістапад 1927 г. прапала: у сельскіх мясцовасьцях—5025 шт. [illegible] гарадох—81 шт.; [illegible] у сельскіх мясцовасьцях—4489 шт. і гарадох—104 шт. Усяго выплачана ўзнагароды па гэтым страхаваньні 255.070 руб.

ЗДАРЭНЬНІ.

ПАЖАР.

У Неманскім лясьніцтве ад невядомай прычыны выбухнуў пажар. Агнём зьнішчана гумно, якое належала лясьніцтву разам са збожжам. Прычыны пажару высьвятляюцца.

ХУЛІГАНСТВА.

Рабочы заводу „Беларусь" Блікман 1-га студзеня ўварваўся ў дом гр-на Анэфатара, праж. на Пралетарскай вул. д. № 30, пабіў там вокны, зьбіў жыльцоў і інш. Блікман прыцягнецца да адказнасьці за хуліганства.

АФЯРА МАРОЗУ.

У лесе каля вёскі Лісіна (Барысаўскі райён) знойдзен труп гр-на С. Філіпенка.

Дазнаньнем устаноўлена, што апошні зьмёрз.

Паштовая скрынка.

Начскладу Патрыкоўскага вучпункту. Па вашаму лісту высьвятлена, што зарплата за правязьненьне дапрызыўнікоў ім выплачана 23 сьнежня 1927 г. За астатнія дні абучэньня грошы акраўленкаматам будуць выплачаны пасьля атрыманьня іх ад штабу Беларускай Ваеннай Акругі.

Водгукі на карэспандэнцыі.

— На допісу „Дзе мы дабіваемся вынашэньня" („С. Б." № 95 ад 28-IV—27 г.) высьветлена, што пры „землеўпарадкаваньні ў 1926 г. у карыстаньне насяленьня былы кавалак лесу мясц. знач. плошчай [illegible] чвэрткі дзесяціны. Гэты лес насяленьні быў высечан для сваіх патрэб, але некаторыя з іх не зналі адразу пабудавацца на пасёлку і лесаматэрыялу не скарысталі.

Апавяшчэньне.

— У сераду, 4 студзеня, а 8 гадз. вечара ў Цэнтр. Габінэце Агітпрапаганды (клюб імя Карла Маркса, вул. Энгельса) адбудзецца канфэрэнцыя членаў гурткоў самасьвета і індывідуалаў, вывучаючых гісторыю УсеКП(б). Явка ўсіх паказаных таварышоў абавязковая.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ПРАДАЕЦЦА
зрыў-папера, макулатура і старыя газэты.
Спытацца ў канторы газэты „Савецкая Беларусь"
(Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Савстаў).

НА АСНОВЕ § 64 СТАТУТУ
Праўленьне Беларускага Банку Камунальнае Гаспадаркі, і Кватэрнага Будаўніцтва
гэтым даводзіць да ведама акцыянэраў Банку, што на 20 студзеня 1928 г. а 2 гадзіне дня
СКЛІКАЕЦЦА
АГУЛЬНЫ СХОД АКЦЫЯНЭРАЎ БЕЛКАМУНБАНКУ.
Агульны сход будзе праходзіць у памяшканьні Банку (Савецкая 68).
Пытаньні, якія падлягаюць абгаворанью і вырашэньню сходу:
1) Даклад Праўленьня, заключэньне Рэвіз. Камісіі аб працы Банку за 1926-27 г. і зацьверджаньне гадавой справаздачы;
2) Павялічэньне асноўнага капіталу Банку;
3) Разьмеркаваньне прыбытку;
4) Выбары Савету, Праўленьня і Рэвіз. Камісіі;
5) Бягучыя справы.
Праўленьне.

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА»	Сучасная драма „ЖЕНА" у 6 частках. Зьвыш праграмы—Рычард Толмэдж у камэдыі «Ловкие дельцы» у 6 частк.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка, 3-га студзеня, новая загранічная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ" маст. драма ў 6 частках. АНОНС! Наступная пастаноўка амэрыканскі баніка «ВЕЧНАЯ БОРЬБА»
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З аўторка 3 студзеня, „ВАША ЗНАКОМАЯ" Суч. бытавая драма ў 6 частк.
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".	З аўторка, 3 студзеня, 3-я апошняя серыя „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ".)—(Кіно-раман у 8 частках.)—(

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА
Менскага Гарадзкога Савету
№ 32.
31 сьнежня 1927 году.
МЭТАХ АХОВЫ ЖЫВЁЛЫ АД СУРОВАГА АБЫХОДЖАНЬНЯ
Менскі Гарадзкі Савет ПАСТАНАЎЛЯЕ:
1) Забараніць: а) суровае абыходжаньне з жывёлай, напрыклад: напясеньне ўдараў палкай і інш. прадметамі, даводзячае да катаваньня;
б) хуткую язду з цяжкім грузам;
в) выяжджаць на раскованых конях, кепска запражаных;
г) працаваць на хворых конях, якія кульгаюць ці маюць раны;
д) падняцьцё ўпаўшага каня, які быў запражаны, ударамі, а ў гэткіх выпадках абавязкова выпрагаць яго.
е) перавозку жывёлы са зьвешанымі галовамі;
ж) пераносіць жывых птушак і іншую жывёлу з апушчанымі ўніз галовамі.
2) Нагляд за выкананьнем гэтае пастановы ўскладаецца на міліцыю і Взтэрынарны нагляд.
3) Вінаватыя ў парушэньні гэтае пастановы падлягаюць штрафу ў адміністрацыйным парадку да 50 руб. ці прымусовым работам да 3-х тыдняў.
4) Пастанова ўступае ў сілу праз 7 дзён з моманту яе апублікаваньня.
Старшыня Гарсавету ЯЦКЕВІЧ.
Сэкратар ПАСЫНКОЎСКІ.

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ІНСПЭКТАР ГАНДЛЮ ДАВОДЗІЦЬ
да ўсеагульнага ведама, што ім на падставе палажэньня аб гандлёвай рэгістрацыі 31 сьнежня 1927 г. унесена ў кнігу «Б» 3-га разьдзелу гандлёвага рэестру СССР па Менскай акрузе пад № 22
ПРАДСТАЎНІЦТВА АКЦЫЙНАГА ТАВАРЫСТВА
„ЭЛЕКТРОСЕЛЬСТРОЙ"
Месцазнаходжаньне: Менск, гасьцініца «Европа», пакой № 76.
Менскі Акр. Інспэктар Гандлю ДАНІШЭЎСКІ.

ЭЛЕКТРОСЕЛЬСТРОЙ.
(Акционерное Общество по электрофикации сельского хозяйства)
ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ГОСУЧРЕЖДЕНИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ЛИЦ, ЧТО ОБЩЕСТВОМ С 1-1-28 Г.
открывается представительство для всего БССР в городе Минске,
которое будет производить обследование районов,
составление предварительных смет,
производить сооружение электрических станций и электрических сетей и полное электрооборудование крахмально-паточных, маслобойных и лесопильных заводов.
По всем вопросам заинтересованным лицам обращаться Минск, гостиница «Европа» к управляющему Представительством Фрицерову С. В.

Ліквідацыйная Камісія па справах Белаўтапрамгандлю
АБВЯШЧАЕ,
што ў понядзелак, 9-га студзеня, а 12 гадзіне дня па Вяземскай вул. (раён. конны парк Белаўтапрамгандлю) ПРЫЗНАЧАНЫ
ТАРГІ НА ПРОДАЖ БУДЫНКАЎ ранейшага коннага парку,
а ўласна: пуня з бярвеньняў, з дошчак: пуня, канторка, кузьня, паркан і вадаправодная электрычная ўстаноўка.
Таргі пачнуцца з сумы ацэнкі—з 3920 руб.
Прыватныя асобы, якія хочуць браць удзел у таргох, уносяць у Ліквідком (Савецкая 82), да адчыненьня таргоў, залог у разьмеры 10 проц. паказанай сумы.
Аглядаць азначаную маемасьць можна штодня ад 2-й гадзіны дня.
ЛІКВІДАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ ПА СПРАВАХ БЕЛАЎТАПРАМГАНДЛЮ.

Издания год 6)(ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА 1928 г.)(Издания год 6
ПОДПИСНОЙ ГОД НАЧИНАЕТСЯ 1-го ОКТЯБРЯ 1927 г.
И ЗАКАНЧИВАЕТСЯ 30 СЕНТЯБРЯ 1928 г.
„КРАСНАЯ ДЕРЕВНЯ"
Еженедельный крестьянский журнал с картинами и портретами.
52 НОМЕРА ЖУРНАЛА — Подписчики „КРАСНОЙ ДЕРЕВНИ" БЕЗ ПРИЛОЖЕНИЯ получат: ГЛАВНЫЕ ОТДЕЛЫ ЖУРНАЛА: Политика.—Землеустройство.—Сельское хозяйство: земледелие, скотоводство, птицеводство, садоводство, огородничество, травосеяние.—Кооперация.—Новости со всех концов света.—Ответы и справки на все вопросы.
4 раскрашенных КАРТИНЫ-ПЛАКАТА.
Подписчики „КРАСНОЙ ДЕРЕВНИ" с приложениями, кроме того, получат:
12 книг Политической библиотеки: 1) Задачи партийной ячейки в деревне, 2) Как коммунисту-крестьянину вести свое хозяйство, 3) Крестьянин и изба-читальня, 4) О борьбе с бюрократизмом советского аппарата в деревне, 5) Почему середняку нужен союз с бедротой, 6) О крестьянском активе, 7) Народный суд в деревне, 8) Как не надо работать комиссиям при сельсовете, 9) Крестьянка и ее общественная работа в деревне, 10) Как организовать коневодческую кооперацию, 11) Передовое сельско-хозяйств. и кредитное товарищество, 12) Как и почему крестьянину надо беречь лес.
15 книг с рисунками „Улучшим свое хозяйство": 1) Самый выгодный способ сбыта молока. 2) Сколько надо земли, чтобы с выгодой работать. 3) Как увеличить количество кормов в хозяйстве. 4) Как бедняку завести доходное хозяйство. 5) От курицы можно получить 150 яиц в год. 6) Как вырастить хорошую крестьянскую лошадь. 7) Что можно приготовить из молока. 8) Как устроить рассадник и вырастить хорошую рассаду. 9) Испытанные способы уничтожения сорных трав. 10) Как вырастить крупную кормовую свеклу и брюкву. 11) Домашняя аптечка для скота и подача первой помощи скоту. 12) Как получить большой урожай картофеля. 13) Минеральные удобрения дают высокие урожаи. 14) Как кормить поросят, чтобы получить самую дорогую свинину (бекон). 15) Как можно использовать картофель.
4 книги с рисунками „Ремесла, полезные в крестьянстве". 1) Корзинноплетение. 2) Выделка рамочных ульев для пчел. 3) Выделка ободьев и колес. 4) Простые способы гонки смолы и дегтя.
3 книги „На досуге": 1) Рассказ. 2) Пьесы для деревенского театра. 3) Сборник стихов селькоров.
3 особых приложения—альбома: 1) Альбом лучших пород скота и птицы. 2) Огнестойкое строительство. 3) Крестьянское домоводство.
5 полных руководств по сельскому хозяйству: 1) Машины и орудия в крестьянском хозяйстве. 2) Лен и конопля. 3) Крестьянское овцеводство. 4) Как выращивать самому семена лучших кормовых трав. 5) Доходн. ягодный сад.
Необходимое для каждого хозяйства руководство: ПРАВИЛЬНОЕ ВЕДЕНИЕ МНОГОПОЛЬНОГО ХОЗЯЙСТВА.
Кроме того, все подписчики в декабре получат СТЕННОЙ КАЛЕНДАРЬ на 1928 год.
Подписываться на „КРАСНУЮ ДЕРЕВНЮ" можно во всех почтовых отделениях СССР, не платя за пересылку подписных денег. Можно подписные деньги пересылать по адресу: Ленинград, просп. 25-го Октября, д. 42. Контора редакции „Красная Деревня".
ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1) Без приложения: на 1 месяц—20 к., на 3 м-ца—60 коп., на полгода—1 р. 20 к., на год—2 р. 20 к. 2) С приложениями: на 3 месяца—1 р. 25 к., на полгода—2 р. 50 к., на год—4 р. 80 к.

Менскі ЗАГС выклікае на 30 студзеня г. г. гр-на СКІБІНСКАГА Балеслава Іванавага па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай СКІБІНСКАЙ Ганнай Грыгораўнай.

Менскі ЗАГС выклікае на 30 студзеня 1928 г. гр-ку КУГЕЛЬ Фруму Барэзаву па справе скасаваньня шлюбу з гр-нам КУГЕЛЬ Залманам Абрамавым.

Аршанскі Загс паведамляе, што гр-н БАЗЫЛЕНКА Пётра Парфіраў, які пражывае ў г. Горны на Нова-Выгінскай вул., падаў заяву аб зьмене імя і прозьвішча: імя Пётра на „Паўлін" і прозьвішча Базыленка—на „Горны"

ЗГУБЛЕНЫ:

— Чырвонаарм. кніжка Шыдлоўскага А. выд. штабам 5 стр. палка 2-й белар. дывіз. у 1926 г., кв. № 213.

— Конская карт. Корзун С., выд. вайсков. сталом Чэрвенск. РВК, кв. 214.

— Кандыд. карт. № 16523 Сьвярдлова М. Ш. Менакрэтрахкас, кв. № 215.

— Пасьведчаньне Бадуновай-Грыб П. А., выд. наркамасабсэм, кв. № 216.

— Водпускны білет № 17589, 2) літар. ф. за № 832198 ад Масква да Ленінграда і асабовае пасьведчаньне ад 1-IX-27 г., усе дакументы выд. вайсков. мэдыц. аддзем. на імя Піліпенка Д. С., кв. № 218.

— 5 білетаў 6 проц. выйграш. пазыкі выпуску 1922 г. за № сер. 02 № 260431, сер. 06 № 329505, сер. 06 № 329506, сер. 06 № 1348331, сер. 06 № 1348332. Адрас: Менск, Ленінская 34 „Книга—Деревне" Пайкіну.

— Сяброўскі білет № 14386, Маскалёва П. С.—выд. саюзам будаўнікоў кв. № 204

— Лекавая кніжка № 11247, Маскалёва П. С.—выд. саюзам будаўнікоў Плешчаніцк. райёну, кв. № 205.

— Пасьведчаньне № 496, Маскалёва Н. С.—выд. Барысаўск. дарожным пададз. кам. гасп., кв. № 206.

— Каапэрац. кніжка і квіт на здачу марак, Курэо С. І.—выд. МЦРК, кв. № 20

— Дапрызыўн. карт, Каган Б. Д.—выд. вайсков. аддз., Талачынскага РВК кв. № 208.

— Патэнт 1-га разр. на пякарню—выд. ПКФ, на імя Дінерштэйна Х. І., кв. № 209. Лекавая кніжка, Ліхаўскай Е. І.—выд. Менакрэтрахкасай, кв. № 210.

— Каапэрац. кніжка Галкі